Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!

Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА

ЧАЦЬВЕР
25 лютага 1932 г.
№ 45 (3434)

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: Перадавая—Важнейшае калгаснае зьвяно. Вопыт змаганьня Бабруйскага гарсавету за месца ў «Чырвонай шнізе».

Важнейшым зьвяном у арганізацыі працы ў калгасах павінна стаць калгасная брыгада (3-ая стар.).

ПАСТАНОВА ЦК КП(б)Б аб чарговых мерапрыемствах па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў (3 стар.).

Месячнік дапамогі дарожнаму будаўніцтву (2-ая стар.).

Вышэй якасныя паказьнікі прамысловасьці ў чацьвертым заключным.

ЗА МЯЖОЮ. (1-ая стар.).

Рабочыя Менску вітаюць пастанову ўраду (1-ая стар.).

ЗА МЯЖОЮ

Японскае войска адступіла на ранейшыя пазіцыі

БЭРЛІН, 23-II. Шанхайскі карэспандэнт Ульштэйнаўскага газэтнага канцэрну паведамляе, што сёньня ўвечары японцы спынілі на ўсёй лініі фронту ваенныя дзеяньні. Мяркуюць, што яны не адмовяць наступленьне да прыбыцьця новых падмацаваньняў. Гэта выдатнае рашэньне японскага камандаваньня, у першую чаргу, зьяўляецца рэзультатам кітайскай атакі на поўмач ад Лінвана, што прымусіла правае крыло японскага войска да адступленьня.

Кітайскае войска, наступаючы на поўнач, праз Усунскі канал абыйшло правы японскі фланг і адбіла вёску Мяоцзянзы на поўдзень ад Лінвана, якую гэтай ноччу заняли японцы. Пасьля гэтага, правае крыло японскага войска было адцягнута і японцы спынілі ваенныя дзеяньні.

Кітайцы ня ўступілі ні пядзі

ШАНХАЙ, 23-II. Ва ўчарайшых грандыёзных бёях кітайскае войска ўтрымала ўсе свае пазіцыі, не аддаўшы ні пядзі зямлі, больш моцнай, узброенай па апошнім слову тэхнікі, японскай армії. Нават штаб японскай армії вымушаны прызнаць, што «прасоўваньне, якое спачатку праводзілася паводле плану, замаруздзілася».

Страты японскага войска, відавочна, надзвычайна вялікія, бо нават японскі штаб гаворыць аб 300 параненых і забітых за ўчарайшы дзень. Колькасьць ахвяр з боку кітайскага войска невядома. Шпіталі сэтльмэнту ўчора прынялі 400 параненых салдат.

Правал японскага наступленьня

ШАНХАЙ, 23-II. Сёньня на Цзянвэньскім фронце працяжваюцца ваенныя дзеяньні з удзелам японскіх самалётаў і бомбамётаў. Аднак посьпехі японцаў нязначныя. Дагэтуль японцы ня могуць выдасьціць кітайцаў.

На Усунскім фронце становішча бяз зьмен. У раёне Чапэю адбываюцца невялікія сутычкі. 5 японскіх бомбавозаў у справаджэньні 3 зьнішчальнікаў два разы атакавалі аэрадром Хунжао, скінулі 18 бомбаў і разбурылі 3 старажытныя кітайскія будынкі.

Умоцнена распаўсюджваюцца весткі, што кітайскае войска пачне наступленьне з Цутуна «прадмесьця Шанхаю».

18 бамбавозаў зьнішчаюць кітайскую вёску

ШАНХАЙ, 23-II. Паветраны бой ад быўся над вёскай Чэнжу, дзе японскія самалёты бамбардыравалі радыё станцыю. Паводле кітайскіх паведамленьняў, адзін японскі самалёт быў зьбіты, астатнія зьнікілі.

18 японскіх бамбавозаў прынялі ўдзел у бамбардыроўцы Тазана (вёска каля Чапэю). Было скінута больш 30 бомб. У выніку бамбардыроўкі раз бурана многа дамоў і забита больш 40 кітайскіх жыхароў. Разбураная вёска апусьцела.

Дзьве новыя японскія дывізіі ў Шанхаі

ШАНХАЙ, 23-II. Газэта «Чайна Прэс» паведамляе, што ўчора ў Путуне (прыгарад Шанхаю на другім беразе ракі Хуанпу) высадзіўся авангард двух японскіх дывізій, у складзе, прыкладна 1.500 штыкоў, астатняе войска ў складзе 15.000 штыкоў чакаецца сёньня. Газэта «Шанхай Таймс» паведамляю, што японцы што дня высаджаюць новыя ваенныя падмацаваньні.



Правакацыя японскага генштабу

ШАНХАЙ, 23-II. Японскія самалёты скінулі ў Шанхаі лістоўкі, падпісаныя «ЦК Гаміндана». У лістоўках заяўляецца, што «19 Кантонская армія пачала вайну супроць японскага войска бяз санкцыі Нанкінскага ўраду, тым самым нанёсны вялікае гора вялікай колькасьці нявінных людзей» Далей у лістоўцы гаворыцца, што Гаміндан рашуча супрацьчыць супроць дзеяньняў 19 арміі і заклікае народ да паўстаньня і зьвяржэньня кіраўнікоў 19 арміі.

Гаміндан дапамагае японскай ваеншчыне

ШАНХАЙ, 23-II. Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што кантонскае войска гатова выступіць у правінцыю ў Вянсінь для прыгнёбленьня камуністычнага руху. Толькі посьля ажыцьцяўленьня гэтай задачы войска будзе накіравана ў Шанхай у якасьці падмацаваньня 19 Кантонскай арміі.

Рост нянавісьці супроць акупантаў

ПАРЫЖ. 18-II. Брусельская «Лібр Бальжык» зьмяшчае ліст з Цыцыкара, у якім гаворыцца аб нябывалым узьдме нацыянальнага руху ў Кітаі.

Карэспандэнт газэты піша, што аўтарытэт генэралаў, якія прадалісь Японіі хутка падае: «пехацінцы—гаворыцца ў лісьце—у вялікай колькасьці, раптам пакідаюць генэралаў, якія знаходзяцца пад японскім уплывам і паступаюць на службу да незалежных ад Японіі генэралаў. У касу незалежных генэралаў паступаюць добраволыныя ахвяраваньні ад туземнай буржуазіі і ад інтэлігенцыі, таксама як і нязначныя ахвяраваньні беднякоў. Жанчыны ўзялісь за шыцьцё, каб забясьпечыць цёплай вопраткай салдатаў анты-японскіх армій. Пры наступленьні японцаў жанчыны не па баяліся апусьціцца ў акопы, каб прынесьці падарункі абаронцам.

Новая пасылка англійскага войска ў Шанхай

ЛЁНДАН. 23-II. Як паведамляюць з Бамбэю, другому батальёну ўсходнялянкашырскага палка англійскага войска загадана накіравацца ў Шанхай.

„Чырвоная армія—армія пераможнай рэвалюцыі"

ПАРЫЖ. 23-II. У сувязі з 14-й гадавінай Чырвонай арміі, орган французскай кампартыі «Юманітэ» друкуе артыкул, у якім падрабязна прыводзіць гісторыю Чырвонай арміі і апісвае яе арганізацыйную структуру і палітычнае жыцьцё. «Юманітэ» зазначае, што у той час як у Францыі на 1 тысячу жыхароў прыходзіцца 15-17 салдат, у СССР усяго толькі 3,5 чырвонаармейцаў. Ваенныя выдаткі, якія прыходзяцца на кожнага жыхара Францыі у пяць разоў больш, чымся ў СССР.

«Сама ваенная арганізацыя Чырвонай арміі, піша «Юманітэ», яе тэрыторыяльная і міліцыйная сыстэма, выніжэньне пастаяннага кантынгенту РСЧА, скарочаньне тэрміну ваеннай службы, а таксама ўся палітыка міру, якая праводзіцца СССР, паказвае рабочым усяго сьвету, што толькі дыктатура пралетарыяту робіць магчымым разбраеньне, бо яна зьяўляе асноўную прычыну вайны—капіталістычны рэжым.

Чырвоная армія—гэта армія рэвалюцыі ўжо пераможшай 6-ай часткі сьвету. Чырвоная армія—гэта армія сусьветнага пралетарыяту, які ў выпадку вайны павялічыць склад у Чырвонай арміі сваёй барацьбой ў краінах капіталу. У гэтым галоўная сіла Чырвонай арміі».

Забастоўкі салідарнасьці

ВАРШАВА, 23-II. У Дамброўскім басэйне на 23 шахтах бастуюць 27.000 гарнякоў. У сувязі з вырываньнямі падземні ў Дамброве ўчора на адной з буйнейшых шахт Верхнеі Сілескай вугальнай прамысловасьці—Лура выбухнула забастоўка салідарнасьці. Бастуе 1.400 чалавек. Прафбюракраты забастоўкі не прызнаюць і абвяшчаюць яе «дзікай».

Канфэрэнцыя саюзу мэталёўцаў у Катовіцах (Верхняя Сілезія) таксама пастанавіла абвесьціць забастоўку салідарнасьці з бастуючымі гарнякамі, пачынаючы з 26 лютага.

Канвеер катаржных прысудаў

ВАРШАВА, 23-II. Каліскім акруговым судом вынесены прыгавор па справе 33 абвінавачваемых у прыналежнасьці да кампартыі. Прыгаворены 5 абвінавачваемых да 5 год катаржнай турмы. Пяць да 4-х год, два да аднаго году, два да 6 месяцаў, адзін да аднаго месяца турэмнага зьняволеньня.

Сёньня ў Лётзінскім акруговым судзе была заслухана справа па абвінавачаньні 5 рабочых у камуністычнай дзейнасьці. Суд прыгаварыў аднаго абвінавачваемага да 8 месяцаў, 3-х да 6 месяцаў турэмнага зьняволеньня.

Кантон аддаў сваю армію для абароны ад японцаў

БЭРЛІН. 23-II. Паводле паведамленьня шанхайскага карэспандэнта «Бэрлінэр Тагеблят», кантонскі ўрад апублікаваў адозву да ўсяго кітайскага народу. У адозьве гаворыцца, што ў гэты ракавы час, кантонскі ўрад адмаўляецца ад барацьбы з Нанкінам.

Кантонскі ўрад прадставіў сваю армію ў распараджэньне кітайскай рэспублікі і чакае, што кожны кітаец выканае свой нацыянальны абавязак у барацьбе супроць японскага войска. Адозва падпісана ўсімі лідэрамі кітайскага нацыянальнага руху ў Кантоне.

Фінансавае становішча Японіі пагражаючае

ТОКІЁ, 23-II. Агенцтва Сімоун Рэнга зазначае на тое, што, як урадавыя, так і фінансавыя колы заклапочаны рэкспартам заграніччых капіталаў з Японіі заграніцу. Заграніччыя банкі, улічваючы магчымыя вынікі шанхайскага інцыдэнту, адмаўляюцца адтэрмінаваць плацяжы японскіх фірм і настойваюць на ўплаце наліччымі. У бліжэйшы час прадстаіць пазрыцьцё брытанскай пазыкі ў 60 млн. іён і амэрыканск. пазыкі ў 135 млн.

Баі ў раёне Цзяндау

ТОКІЁ, 23-II. Агенцтва Сімбун Рэнго паведамляе, з Мукдэну, што ў сувязі з абвастрэньнем становішча ў раёне Імяньпо (усходняя лінія Кітайска-Усходняй чыгункі) японскай брыгадзе Курай, размешчанай у Ляояне (у раёне Паўднёва-Манчжурскай чыгункі) загадана накіравацца ў Харбін.

***

МУКДЭН, 23-II. Паводле паведамленьняў штабу японскай арміі, японскім часьцям 19 чысла ўдалося, быццам, адбіць атакі бінысянскага войска ў раёне Дуньхуа (недалёка граніцы Карэі).

Згодна гэтых паведамленьняў, бінысянскае войска адступіла ў Цзяндзу ў раёне Цзяндау на поўдзень ад Дуньхуа. Адначасова з гэтым паведамляецца, што бінысянскае войска пасьля заняцьця Большахе (на поўдзень па ўсходняй лініі Кітайскай-Усходняй чыгункі) прасунулася да Ямапо.

Учора раніцою кавалерыя бінысянскага войска ў складзе 200 чалавек увайшла ў Ямапо.

Рабочыя Менску вітаюць пастанову ўраду

аб пазбаўленьні права савецкага грамадзянства контррэвалюцыянэраў-эмігрантаў

З рэзалюцыі сходу рабочых, ІТР і служачых чырвонаштандарнага заводу „Бальшавік"

Адабраем пастанову ЦВК СССР аб пазбаўленьні права грамадзянства і забароне ўезду ў СССР контррэвалюцыянэраў, якія жывуць заграніцай у якасьці эмігрантаў і захавалі яшчэ савецкі пашпарт.

Троцкіст, Абрамовічы, Бэрнштэйны, Айзэнштаты і іншыя за падачкі капіталістаў робяць адрадніцтва за здрадніцтвам і заключаюць саюзы з міжнароднымі жандарамі Гітлярамі, на адзінства дзеяньняў.

Перад тварам рабочай клясы ўсяго сьвету мы заяўляем, што ніякія прудпасьці росту нам ня страшны. Мы бярэм на сябе абавязкі—яшчэ больш напружыць свае сілы на бесьперабойнае выкананьне праграмы 1932 г., на поўную рэалізацыю 6 умоў тав. Сталіна, на яшчэ большае ўкараненьне мэтадаў камуністычнай працы—сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Братэ капіталістычных краін! Ганеце гэтых капіталістычных лёкаеў—вашых здраднікаў, ад рабочых арганізацый, вядзеце барацьбу за хутчэйшае вызваленьне рабочых, якія яшчэ адурманены сацыял-дэмакратамі вашых краін і эмігрантамі з СССР. Мы іх выкінулі з нашай краіны і яны заграніцай разгарнулі сваю здрадніцкую работу супроць сацыялістычнага будаўніцтва, якое мы ажыцьцяўляем і ў якім дамагліся вялізарных посьпехаў пад ленінскім кіраўніцтвам нашага ЦК УсеКП(б) і правадыра сусьветнага пралетарыяту тав. Сталіна.

Мы разам з вамі зьнішчым усіх ворагаў рабочае клясы і пабудуем сусьветны Кастрычнік.

Няхай жыве ленінскі ЦК УсеКП(б) на чале з яго правадыром тав. Сталіным.

Няхай жыве камуністычны інтэрнацыянал!

З рэзалюцыі сходу рабочых, ІТР і служачых заводу імя Варашылава

Адабраем пастанову ЦВК СССР аб пазбаўленьні права грамадзянства і забароне ўезду ў СССР контррэвалюцыянэраў, якія жывуць заграніцай у якасьці эмігрантаў і захавалі яшчэ савецкі пашпарт.

Троцкіст, Абрамовічы, Бэрнштэйны, Айзэнштаты і іншыя за падачкі капіталістаў робяць адрадніцтва за здрадніцтвам і заключаюць саюзы з міжнароднымі жандарамі, Гітлярамі, на адзінства дзеяньняў.

Перад тварам рабочай клясы ўсяго сьвету мы заяўляем, што ніякія прудпасьці росту нам ня страшны. Мы бярэм на сябе абавязкі—яшчэ больш напружыць свае сілы на бесьперабойнае выкананьне праграмы 1932 г., на поўную рэалізацыю 6 умоў тав. Сталіна, на яшчэ большае ўкараненьне мэтадаў камуністычнай працы—сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Выгляд чырвонаармейскай спальні ў казарме.

За жорсткую фінансавую дысцыпліну,

за няўхільнае ажыцьцяўленьне гаспадарчага разьліку

Белшвэйаб'яднаньне ня выконвае сваіх фінабавязацельстваў перад дзяржавай

Пастанова НКФіну БССР аб продажу запасаў сыравіны і гатовай прадукцыі, аб прымусовым спагнаньні ня выдоймак і налажэньні арышту на бягучы рахунак Белшвэйаб'яднаньня, прадыктавана неабходнасьцю захаваньня жалезнай фінансавай дысцыпліны, рашучага ажыцьцяўленьня палітыкі кантролю рублём, гаспадарчага разьліку і новай крэдытнай рэформы.

За што спынены крэдыты Белшвэйаб'яднаньню?

Чаму НКФ прыняў такія сільныя меры ўзьдзеяньня?

Таму, што гаспадарчае кіраўніцтва аб'яднаньня парушыла, самым грубым чынам, асновы гаспадарчага разьліку. 5.736.572 руб. надомак дзяржаўне за кароткі перыяд часу—сьведчыць аб тым, што забыты асновы гаспадарчага кіраўніцтва. Гэта сьведчыць аб тым, што кіраўніцтва Белшвэйаб'яднаньня не зразуміла значэньня палітыкі кантролю рублём. Ці былі ўмовы для нармальнай работы аб'яднаньня? Ці можна спасылацца на «аб'ектыўныя» прычыны?—Такіх прычын ня было. Наадварот, былі ўсе спрыяючыя ўмовы для выкананьня прамфінпляну. Прадпрыемствы Белшвэйаб'яднаньня былі забясьпечаны сыравінай на 100 проц. Рабочыя-швэйкі, якія паказалі ўзоры сацыялістычных адносін да працы, выканалі пяцігодку швэйнай прамысловасьці ў 2 з паловаю гады,—і цяпер па-бальшавіцку вядуць барацьбу за далейшае выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну. Чаго-ж ня было?

Ня было цьвёрдага гаспадарчага кіраўніцтва, няма ўпартай работы па замацаваньні здабытых посьпехаў, не праяўлена гібкасьць і апэратыўнасьць у рабоце. Незаконна, «у поўнай супярэчнасьці з гаспадарчым разьлікам і законам аб крэдытнай рэформе» аб'яднаньне заплаціла за ўтварэньня вялікія запасы сыравіны 4.000.000 руб. за кошт сродкаў, прызначаных дзяржаўнаму бюджэту. На прадпрыемстве не ўзначалена барацьба за выкананьне колькасных і якасных паказьнікаў прамфінпляну I кварталу 1932 году. Стваральныя лішкаў сыравіны пры невыкананьні паказьнікаў прамфінпляну, «зьяданьне» дзяржаўных бюджэтных сродкаў—усё гэта тое, што закрывае каналы нармальнага фінансаваньня швэйнай прамысловасьці.

Пастанова НКФ павінна напомніць усім гаспадарчым арганізацыям, асабліва Белшвэйаб'яднаньню, аб неабходнасьці на справе ажыцьцяўляць гаспадарчы разьлік, аб кантролі рублём, як аб цьвёрдай палітыцы партыі, ня існуючай толькі для «запалохваньня», што правілы крэдытнай рэформы—жалезныя законы сацыялістычнага гаспадараваньня.

Кіраўніцтва Белшвэйаб'яднаньня павінна зрабіць адпаведныя вывады з пастановы НКФ. Павінны быць прыняты тэрміновыя меры. Трэба ўзмацніць барацьбу за выкананьне прамфінпляну. Пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі трэба перабудаваць работу і стварыць правільныя суадносіны паміж фінансавымі і вытворчымі мерапрыемствамі. Гатовая прадукцыя павінна быць хутка прасунута да рабочага пакупніка.

Рабочыя і работніцы швэйнай прамысловасьці БССР, якія ня раз даказалі свае сацыялістычныя адносіны да працы, і на гэты раз праз разгорнутае сацспаборніцтва і ўдарніцтва павінны выканаць прамфінпляны I кварталу 1932 г.

Пастанова НКФ БССР аб Белшвэйаб'яднаньні павінна зьявіцца апошнім перасьцярогай усім гаспадарчым аб'яднаньням аб неабходнасьці няўхільнага ажыцьцяўленьня бальшавіцкага гаспадарчага разьліку і выкананьня фінансавых абавязацельстваў перад дзяржавай.

Пастанова Народнага Камісарыяту Фінансаў БССР

Прымаючы пад увагу становішча нядоімкі па Белшвэйаб'яднаньні па плацяжох у бюджэт: па падатку са звароту 1.926.270 р., бюджэтных нацэнках—2.110.302 р., адлічэньня ад прыбытку 1.700.000 р.—разам 5.736.572 р. і што Белшвэйаб'яднаньне ня толькі ня прыняла рашучых мер да мабілізацыі сродкаў, асеўшых у яго прадпрыемствах для разьліку з бюджэтам па чарговых плацяжох, але наадварот, дзякуючы надпрыняцьцю мер, недастатковаму правядзеньню ў сваёй рабоце гаспадарчага разьліку стварылася дэмабілізацыя сродкаў, якая выражаецца ў тым, што пры 100 процантным выкананьні плану завозу сыравіны, прадпрыемствы Белшвэйаб'яднаньня ня выканалі і сваіх вытворчых праграм, чым стварылі значнае перавышэньне астач на прадпрыемствах запасаў сыравіны, звыш нармалізаваных прыблізна на 4.000.000 р.; што разьлік за паказаныя лішні запасаў сыравіны прадпрыемствамі вытвораны незаконна, у поўным супярэчнасьці з гаспадарчым разьлікам і законам аб крэдытнай рэформе, за кошт сум падлягаючых здачы ў бюджэт.

Народны Камісарыят Фінансаў БССР, кіруючыся палажэньнем аб спагнаньні падатку і збораў, а таксама выходзячы з неабходнасьці безадкладнага выкананьня прадпрыемствамі і арганізацыямі сваіх падатковых абавязацельстваў перад дзяржавай, неабходнасьці ўкараненьня гаспадарчага разьліку праз кантроль рублём ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Прапанаваць сэктару дзяржаходаў і таваразвароту безадкладна прыняць прымусовыя меры да спагнаньня нядоімак, якія лічацца за Белшвэйаб'яднаньнем, шляхам налажэньня арышту на рахунак Белшвэйаб'яднаньня ў Дзяржбанку, сьпісу і продажу запасаў сыравіны і гатовай прадукцыі на складах, базах і прадпрыемствах аб'яднаньня.

Пастанову гэту апублікаваць у друку.

Народны Камісар Фінансаў БССР ХАЦКЕВІЧ.

ВАЖНЕЙШАЕ КАЛГАСНАЕ ЗЬВЯНО

Сёньня мы друкуем важнейшы нормацыўны дакумент — пастанову ЦК КП(б)Б аб чарговых мерапрыемствах па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў. Разьвіваючы асноўныя палажэньні па гэтым пытаньні пастановы ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б у сваім рашэньні з асаблівай выразнасьцю акрэсьліў чарговыя мерапрыемствы па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, устанавіў цьвёрды напрамак, на якім павінна ісьці на даным этапе пераробка селяніна-калгасьніка—учарайшага адноасобніка, у труженіка сацыялістычнай гаспадаркі. Барацьба за ажыцьцяўленьне рашаючых мерапрыемстваў у справе арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, за правільную арганізацыю працы, сапраўдную ліквідацыю абязьлічкі, пастаўлена «ў асяродку ўвагі партыйных, калгасных і зямельных органаў».

Правільная арганізацыя працы ў калгасах на аснове сацыялістычнага плянаваньня—рашаючая ўмова пасьпяховага правядзеньня веснавой кампаніі. Сельска-гаспадарчы сэктар народнае гаспадаркі БССР у чацьвертым завяршаючым годзе пяцігодкі павінен даць краіне 2.850 тыс. га засеву яравых, 7.122 тыс. галоў жывёлы, палялічыць урадлівасьць: па збожжавых культурах—на 12 проц., траў і тэхкультур—15, бульбы—20 проц., узьняць прадукцыйнасьць жывёлы на 20 проц. Праблема якасьці—гэта ў выніку—стрыжань усёй работы. Мала засеяць,—засеў павінен даць высокі ўраджай. Змагаўчыся за кожны га засеву, за кожную галоўку жывёлы парт арганізацыі, рабочыя саўгасаў і калгасьнікі павінны не забываць, што ў цэнтры ўвагі пастаўлена правільная арганізацыя працы, праблема якасьці, барацьба за аўладаньне тэхнікай, агратэхнікай і заатэхнікай.

Дамагчыся рашаючых якасных зрухаў у сельскай гаспадарцы можна толькі пры ўмове пасьлядоўнага ажыцьцяўленьня задач арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, пры ўмове сапраўднай ленінскай барацьбы за ўзьвышэньне прадукцыйнасьці і эфэктыўнасьці працы. «Прадукцыйнасьць працы—вучыць нас Ленінім,—гата ў выніку самае важнае, самае галоўнае для перамогі новага грамадзкага ладу». Упартая барацьба за ажыцьцяўленьне ленінскай устаноўкі, за рэалізацыю шасьці ўмоў тав. Сталіна, сапраўднае ўкараненьне здзеяльнічыны—ў гэтым нарука перамог. Цэнтральнае месца ў падрыхтоўцы і правядзеньні веснавой сяўбы на вінна заняць калгасная брыгада.

ЦК УсеКП(б) у сваёй пастанове аб чарговых мерапрыемствах па арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў указаў, што:

«Важнейшым зьвяном у арганізацыі працы ў калгасах павінна стаць брыгада. У адпаведнасьці з вопытам лепшых сельска-гаспадарчых арцеляй ЦК лічыць мэтазгодным арганізацыю ў калгасах брыгад з пастаянным складам калгасьнікаў з тым, каб як правіла такія брыгады ўтваралі ўсе асноўныя (сельска-гаспадарчыя работы на працягу ўсяго году на пэўных вучастках. Гэтым брыгадам калгас вылучае на час іх работы неабходныя машыны, інвэнтар і рабочую жывёлу, за становішча якіх цалкам адказвае брыгада».

Калгасная брыгада—гата, апорны пункт усёй падрыхтоўчай работы, галоўнае зьвяно барацьбы за ўраджай. Адсюль асноўная ўвага ў арганізацыі працы ў калгасах павінна быць накіравана на стварэньне брыгад. Ад таго, наколькі правільна і своячасова будуць арганізаваны брыгады, залежаць вынікі падрыхтоўкі і правядзеньня сяўбы. Правільна расставіць сілы, падабраць неабходную колькасьць калгасьнікаў, вылучыць цягавую сілу, транспарт, інвэнтар, зброю, устанавіць вытворчае заданьне, вызначыць вучасткі зямлі—вось асноўныя пытаньні, без вырашэньня якіх немыслімо правільная падрыхтоўка да сяўбы.

ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове аба вязвае партыйныя і калгасныя органы правесьці арганізацыю брыгад да 1 красавіка. Да 1 красавіка брыгады павінны быць поўнасьцю падрыхтаваны да сяўбы. Праўленьні калгасаў аба вязаны ўжо зараз, стварыўшы брыгады, даць ім поўную магчымасьць разгарнуць ударную падрыхтоўчую работу. Для гэтага патрабуецца, каб кожная брыгада ня толькі мела свой сталы склад на чале з брыгадзірам, але каб для яе быў вызначаны поўны інвэнтар, цягавая сіла, збруя, транспарт і г. д.

Атрымаўшы своячасова вытворчае заданьне, будучы запікаўленай вынікамі сваёй працы, брыгада раней падрыхтуе сродкі вытворчасьці, складзе свой унутраны брыгадны плян—народ, расстаўіць сілы, вызначыць пэрсанальную адказнасьць кожнага калгасьніка за даручаемую яму работу.

Барацьба за моцную калгасную брыгаду, за правільную яе арганізацыю—важнейшая задача партарганізацый. Нарушэньне асноўных прынцыпаў арганізацыі калгасных брыгад павінна зьявіцца ў корані.

Галоўнай формай арганізацыі калгасных брыгад зьяўляецца, апіраючаяся сяброўна на вопыце, арганізацыя брыгад па вытворчым прынцыпе. Брыгады, так званыя дворкі (насялковыя, хутарскія), якія арганізуюцца выходзячы з тэрытарыяльных прымет, не арганізуюць, а дэзарганізуюць працу. Гэты прынцып арганізацыі брыгад асуджаны праўдкай, а ім трэба весьці рашучую барацьбу. Адзіная правільная форма арганізацыі брыгад, гэта арганізацыя па вытворчым прынцыпе. Тут мы маем больш правільную расстаноўку сіл і сродкаў вытворчасьці, лепшы падзел працы, адсюль, мы маем магчымасьць правільна падаліць вучот, увесьці вызьдзельнічыну, ліквідаваць абязьлічку.

«Асуджаючы марную ў радзе месц практыку арганізацыі брыгад па тэрытарыяльным прынцыпе (так званых брыгад—дворак) і брыгад з нестаянным складам, ЦК прапануе ліквідаваць такія брыгады і на аснове гадовага вытворчага пляну калгасаў і ўліку патрэбнасьці ў рабочай сіле арганізаваць ва ўсіх калгасах брыгады выключна па вытворчым прынцыпе з пастаянным складам брыгад з тым, каб, як правіла, такія брыгады выконвалі ўсе асноўныя с.-г. работы на працягу ўсяго году на поўных вучастках». (ЦК КП(б)Б).

Трэба весьці рашучую барацьбу з шкодлівасьцю складу брыгад, з частымі зьменамі брыгадзіраў. «Склад брыгадзіраў павінен быць бязумоўна пастаянным, што дасьць магчымасьць хутчэй узьнімаць кваліфікацыю іх і ператвараць у сапраўдных арганізатараў калектыўнай вытворчасьці».

Частка людзей, у залежнасьці ад мэтазгоднасьці агульных гаспадарчых задач калгасу, можа быць адкінута на поўны час з брыгады для выкананьня той ці іншай работы, але гэта ня значыць, што брыгады павінны зьмяняць свой склад, калгаснікі перакідацца з адной работы на другую.

Выключную ролю ў арганізацыі брыгад і падборы брыгадзіраў павінны, бязумоўна, адыграць партыйныя і камсамольскія арганізацыі калгасаў. Моцнасьць калгасу будзе залежыць ад моцнасьці брыгад, ад іх работы. Перш за ўсё, унутры брыгады налічваюцца і абгаворваюцца мерапрыемствы на ажыцьцяўленьні вытворчага заданьня, налічваюцца рэалізацыя агратэхнічных мерапрыемстваў, аналізуюцца вынікі працы за пэўны перыяд.

Буйнейшая роля ў арганізацыі калгасных брыгад усклядзецца на МТС. Роля МТС у гэтай справе выключна важная.

Барацьба за моцную калгасную брыгаду будзе праходзіць пры ажыцьцяўленьні элементаў клясавай барацьбы ўнутры калгасаў, унутры сваёй брыгады пры абвастрэньні гэтай барацьбы. Упартае змаганьне за правільную арганізацыю працы на аснове зьдзельнічыны, за ліквідацыю абязьлічкі, устанаўленьне поўнай пэрсанальнай адказнасьці за даручаемую работу—ў першую чаргу натыкнецца на супраціўленьне з боку рвача, падыра, на ўсялякія элементы кулацкай агентуры ўнутры калгасу. Супраціўляючыся сацыялістычнаму наступу, кулацтва і яго агентура будуць імкнуцца скарыстаць малейшыя хібы, памылкі ў арганізацыі брыгад з тым, каб перашкодзіць правільнай арганізацыі працы. Не паслабляючы ні на хвіліну клясавай пільнасьці, партарганізацыі павінны на кожным кроку наносіць зьнішчальны ўдар кулацкаму супраціўленьню.

Рашэньні ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб чарговых мерапрыемствах па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў маюць выключнае палітычнае значэньне на даным этапе калгаснага будаўніцтва. Гэтым рашэньні павінны быць абгаворваны сярод шырокіх калгасных мас. Рашэньні партыі аб чарговых мерапрыемствах па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў—гэта канкрэтная пушёўка кожнай ячэйкі, з якой яна павінна ісьці ў масы калгаснікаў, у брыгады, на вытворчыя нарады, няўхільна змагацца за арганізацыю працы, за ажыцьцяўленьне цэнтральнай задачы — арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.



Новы электрычны сацыялістычнаму транспарту.

ДЭКАДНІК ГЕНЭРАЛЬНАЙ ПРАВЕРКІ

барацьбы за суцэльную пісьменнасьць працягнут да 10 сакавіка

Пастанова Цэнтральнага Штабу па правядзеньні дэкадніку генэральнай праверкі барацьбы за суцэльную пісьменнасьць

1. Працягнуць абвешчаны ЦК КП(б)Б і НКАсьветы дэкадник генэральнай праверкі барацьбы за суцэльную пісьменнасьць да 10-га сакавіка.
2. Лічыць неабходным затрымаць упаўнаважаных па правядзеньні дэкадніка ліквбезу да 1-га сакавіка.
3. Прапанаваць раённым гарадзкім штабам і ўсім цэнтральным установам і арганізацыям прадоўжыць далейшае разгортваньне работы ў барацьбе за поўны ахоп навучаньнем усіх няпісьменных, замацаваньне за вучобай, 100-процантнага наведваньня і ўзьняцьця якасьці працы.
4. Даручыць цэнтральным і мясцовым газэтам арганізаваць далейшае асьвятленьне работы па правядзеньні дэкадніка.
5. Даручыць тав. Шукевічу-Трэцьякову арганізаваць радыё-перадачу на пытаньні аб працягненьні дэкадніку да 10-га сакавіка.

Райвыканкомы, сельсаветы адказваюць за правядзеньне дэкадніка

(Радыёграма райвыканкомам і ўпаўнаважаным культпрогу ЦК)

Паведамеце аб арганізацыі штабу і прынятых мерапрыемствах па дэкадніку суцэльнай пісьменнасьці. У пяцідзённыя зводкі ўключайце мерапрыемствы. Вынікі дасылайце ў газэты. Паведамляйце аб патрэбнай дапамозе. Узьнімеце грамадзкасьць, культармейцаў, камсамол, дэлегатак, калгасьніку, рабочых на барацьбу за суцэльную пісьменнасьць.

Непасрэдная адказнасьць за правядзеньне дэкадніка ўскладаецца на райвыканкомы і сельсаветы.

ЧАРВЯКОЎ.

ЗВОДКА

аб стане ліквідацыі няпісьменнасьці па БССР на 10-га лютага 1932 году

Па БССР усяго ахоплена навучаньнем 242.397 чал., што складае 82,2 проц. Малапісьменных 150.004 чал., альбо 52 проц.

УПЕРАДЗЕ:

Асьвейскі	маецца на вучоце няпісьмен.	1947	ахопл. вучобай	1947—100 проц
Лагойскі	„ „ „	2766	„	2766—100 „
Полацк	„ „ „	4046	„	4005—99 „
Нараўлянскі	„ „ „	3372	„	3315—98,4 „
Чэрвеньскі	„ „ „	3151	„	3031—96 „
Барысаўскі	„ „ „	5946	„	5682—95,6 „
Лельчыцкі	„ „ „	3790	„	3614—95,4 „
Буда-Кашалёўскі	„ „ „	2900	„	2765—95.3 „
Лоеўскі	„ „ „	3208	„	3071—95,7 „

ПРАВАЛЬВАЮЦЬ СПРАВУ ЛІКВІДАЦЫІ НЯПІСЬМЕННАСЬЦІ:

Магілеўскі	маецца на вучоце няпісьмен.	—	ахопл. вучобай	— 54 проц.
Чаускі	„ „ „	4452	„	2443—54,5 „
Капыльскі	„ „ „	2604	„	1677—63,6 „
Шкловскі	„ „ „	6035	„	4012—66,5 „
Петрыкаўскі	„ „ „	7647	„	5172—67,3 „
Быхаўскі	„ „ „	6830	„	4648—68,1 „
Чэрвона-Польскі	„ „ „	3728	„	2607—69,1 „
Рэчыцкі	„ „ „	7400	„	5120—69,2 „
Кычаўскі	„ „ „	2332	„	1632—70 „
Чэчэрскі	„ „ „	3470	„	2500—72 „
Брагінскі	„ „ „	3391	„	2461—72,6 „

Адстаючыя сельсаветы—на грамадзкі буксір

Па Сураскім раёне налічваецца 2672 чал. няпісьменных, з якіх ахоплена вучобай 84,5 проц. Ёсьць у раёне і перадавыя сельсаветы—Пышнянскі, Станькаўскі, Сурашчынскі, Котаўскі, у якіх усе няпісьменныя ахоплены ліквпунктамі. Такіх вынікаў гэтыя сельсаветы дабіліся дзякуючы мабілізацыі ўвагі шырокіх працоўных мас на барацьбу за рэалізацыю дырэктыў партыі і ўраду.

Побач з перадавымі сельсаветамі ёсьць і такія, дзе справа ліквбезу ліквідуецца другараднай. Так, у Яновіцкім, Краўцоўскім, Курынскім і Астроўскім сельсаветах зусім слаба разгорнута праца ліквпунктаў. Больш таго, у Яновіцкім сельсавеце ніводзін няпісьменны не пасаджан за вучобу.

Перадавыя сельсаветы павінны шляхам грамадзкага буксіру дапамагчы адстаючым рэалізаваць дырэктывы ЦК КП(б)Б з тым, каб да 1 мая раён стаў суцэльна-пісьменным.

Івашніў.

Антысавецкія вылазкі настаўніцы Міхалап

Настаўніца Іграсўскай ШКМ (Слуцкага раёну) Міхалап у штодзённай сваёй рабоце выступае супроць ленінскай нацполітыкі.

На школьным савеце і прафкоме Міхалап заказвае, што «руская мова самая прыгожая». «Калі чалавек ня ведае рускай мовы, дык ён ніколі ня зможа выехаць з БССР» і г. д.

Калі ўвесь настаўніцкі калектыў патрабаваў, каб Міхалап адкрыта прызнала свае адносіны да беларусізацыі, дык яна адмовілася. Дрэнныя таксама адносіны Міхалап да вучняў. Яна абзывае вучняў рознымі брыдкімі словамі.

Цікава адзначыць, што вучні некалькі разоў узьнімалі пытаньне на агульных сходах аб дзейнасьці Міхалап. Але загадчык ШКМ Бамаленка, які быў у добрых адносінах з Міхалап, не рэагаваў на гэта.

Адміністрацыя ШКМ, ня гледзячы на тое, што гэта пытаньне пастаўлена прафкомам, утойвае ўсё ад вучняў.

Такія адносіны адміністрацыі школы да адкрытых вылазак вялікадзяржаўнай шавіністкі ў пралетарскай школе ня могуць быць кваліфікаваны інакш як апартуністычныя.

А. Майскі.

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ
Стар. 2 № 45 (3434)

ДА 15-га САКАВІКА

ПОУНАСЬЦЮ ВЫВЕЗЬЦІ БУДМАТАР'ЯЛЫ

На барацьбу з бездарожжам

Шпаркі рост сацыялістычнага будаўніцтва патрабуе неадкладнай рэканструкцыі сеткі грунтавых і шасэйных дарог.

Абвешчаны ЦК КП(б)Б з 15-II да 15-III месячнік дапамогі дарожнаму будаўніцтву ставіць сабе мэтай ліквідацыю прарываў у падрыхтоўцы да дарожна-будаўнічага сэзону.

Да 15 сакавіка павінна быць закончана вывазка будаўнічых матар'ялаў (камень, пясок, граві, лесаматар'ял).

Сваячасовае выкананьне пляну вывазкі гэтых матар'ялаў забясьпечыць сваячасовы пачатак і нармальнае разгортваньне будаўнічага сэзону.

Ня гледзячы на тое, што прайшла ўжо дэкада з дню абвешчаньня месячніка, рад раёнаў яшчэ не раскачаўся і не пераключыўся на баявое выкананьне дырэктыў партыі і ўраду аб дарожным будаўніцтве.

РК КП(б)Б гэтых раёнаў ня выкналі яшчэ дырэктывы ЦК аб тым, што райкомы партыі павінны стаць на чале правядзеньня месячніка і забясьпечыць пасьпяховасьць яго разгортваньня.

Прыклад Жлобінскага раёну сьведчыць аб тым, што некаторыя раённыя арганізацыі бяздушна-бюракратычна адносяцца да справы дарожнага будаўніцтва, што сьвярае пагрозу сваячасоваму выкананьню пляна будаўніцтва.

Такія абураючыя зьявішчы павінны быць неадкладна зьнішчаны. Вінаватых трэба жорстка пакараць.

Побач з гэтым, мы маем рад раёнаў, якія па-бальшавіцку ўзяліся за разгортваньне дарожнага будаўніцтва. Прыклад гэтых раёнаў павінен зьявіцца буксірам адстаючых.

Конкурс на лепшае выкананьне зімовых дарожных работ абвешчаны цэнтральным штабам месячніка зьяўляецца магутным стымулам у разгортваньні падрыхтоўчай работы да дарожна-будаўнічага сэзону.

Мабілізаваўшы шырокія рабочыя, калгасныя і бядняцка-серадняцкія масы на правядзеньне месячніку, мы за бясьпечым хутчэйшае ажыцьцяўленьне дырэктывы XVII Усесаюзнай партканфэрэнцыі аб тым, каб па «дарожным і шасэйным будаўніцтве забясьпечыць больш шпаркія тэмпы разьвіцьця, чымся па іншых відах транспарту».

Неадкладна забясьпечыць будработы рабочай сілай

ВІЦЕБСК, (Наш кар.). На 1-ым і 4-ым вучастках Дарбуду выкананьне пляну затаватак і вывазкі каменьня, гравія, пяску і лесаматар'ялаў стаіць пад пагрозай зрыву.

Сельсаветы і калгасы не забясьпечваюць дарожнае будаўніцтва неабходнай колькасьцю рабочай і гужавой сілай. Так, Шумнянскі сельсавет, які павінен штодзённа даваць 153 падводы, 36 рабочых, за першую палову лютага прадставіў толькі 22 падводы. Гэтым сельсаветам план выхаду на работу выкананы ўсяго на 1,1 проц.

Ня лепшае становішча і ў Рудакоўскім сельсавеце. З 350 падвод патрэбных штодзённа для работы, у сярэднім працавала 57 падвод.

В.-Летчанскі і Старасельскі сельсаветы зусім ня далі для дарожнай работы рабочай сілы.

Кіраўніцтва гэтых сельсаветаў не даацэньвае ўсяе важнасьці барацьбы з бездарожжам.

Гарком партыі пастанавіў уключыць у месячнік дапамогі дарожнаму будаўніцтву і паставіў канкрэтную задачу месячніка—ліквідацыю прарываў па дарожным будаўніцтве, 100-процантнае выкананьне пляну затаватак і вывазкі каменьня, пяску, гравія і лесаматар'ялаў.

Гарком абавязаў вясковыя партыйныя ячэйкі і ўпаўнаважаных ад гаркому, якія зараз знаходзяцца на вёсцы, зараз-жа разгарнуць шырокую масавую работу па мабілізацыі калгасьнікаў, беднаты і серадняцтва на пасьпяховае выкананьне задач месячніка.

Гарсавет, гарпрафсавет, ГК КСМ, райкалгассаюз, праўленьне Аўтадору абавязаны распрацаваць план і парадак прыцягненьня грамадзкасьці да ўдзелу ў месячніку.

Для кіраўніцтва правядзеньнем месячніка пры гаркоме арганізаваны штаб. 25-га лютага намячаецца выезд штабу ў адзін з сельсаветаў Віцебскага раёну.

Язэп Чорны.

Конкурс на лепшае выкананьне зімовых дарожных работ

(З пастановы Цэнтральнага штабу па правядзеньні месячніка)

У мэтах падахвочваньня работы лепшых раённых, сельскіх, камсамольскіх арганізацый, калгасаў і асобных калгасьнікаў, аднаасобнікаў, школ і газэт Савет Народных Камісараў БССР прапанаваў начальніку Галоўдартрансу тав. Фрумкіну выдзяліць спэцыяльны фонд аўтамашын, вэлёсыпэдаў і інш. на суму да 100.000 руб. для прэм'яваньня за пасьпяховую вывазку камню, пяску, гравія, лесу і інш. матэрыялаў.

Прэм'яваньне праводзіцца за пасьпяховае выкананьне райсаветамі, сельсаветамі, калгасьнікамі і аднаасобнікамі заданьняў па вывазцы асноўных матэрыялаў, за садзейнічаньне вярбоўцы і асваеньню рабочай сілы на дарожным будаўніцтве, за адкрыцьцё гравійных і каменных кар'ераў і г. д.

Выдача прэмій будзе вытвараецца цэнтральным штабам неадкладна па выкананьні заданьняў.

Устаноўлен наступны прэміяльны фонд:

2 легкавых аўтамабіля «Форд», 2 грузавых машыны, 5 трактараў «Фордзон», 5 камплектаў сельска-гаспадарчых машын, 20 вэлёсыпэдаў, Мануфактура, абутак, касьцюмы і інш.

Абвяшчаючы конкурс цэнтральны штаб па правядзеньні месячніка зьвяртаецца да ўсіх раённых, сельскіх, партыйных, камсамольскіх, аўтадораўскіх і інш. грамадзкіх арганізацый, калгасьнікаў і аднаасобнікаў з прапановай зараз-жа ўключыцца ў конкурс на лепшае выкананьне праграмы зімовай загатоўкі і вывазкі асноўных будматар'ялаў, вярбоўкі рабочай сілы і яе асваеньню, адкрыцьця гравійных і каменных кар'ераў, на аснове шырокага разгортваньня сацыялістычных форм і мэтадаў працы.

Усе матар'ялы па конкурсу на лепшае выкананьне зімовых дарожных работ накіроўваюць у Менск Галоўдартранс Фрумкіну.

Усе паступаючыя з месц матар'ялы будуць, зараз-жа разглядацца штабам з безадкладнай выдачай прэміі за лепшыя ўзоры выкананьня і перавыкананьня пляну.

Усебеларуская эстафэта „за добрую дарогу"

МЕНСК. Усебеларускі месячнік штурму прарываў у дарожным будаўніцтве да гэтага часу ідзе павольнымі тэмпамі. Пастанова штабу месячніка пры ЦК КП(б)Б аб тым, каб кожны дзень па вывазцы дарожных матар'ялаў працавала 30.000 сялянскіх фурманак—ня выконваецца. На 20 лютага працавала ўсяго 4.200 фурманак.

Партыйныя, савецкія і будаўнічыя ўстановы зараз прынялі меры для ўзмацненьня вывазкі гравія, шчэбня і лесу для дарожнага будаўніцтва.

Дарбуд і Галоўдартранс арганізавалі брыгады з 40 чалавек, якія накіраваны ў адстаючыя раёны.

Вышэйшы савет фізкультуры БССР абвясьціў эстафэту «за добрую дарогу». У эстафэце ўдзельнічае больш 30 раёнаў БССР. Мэта эстафэты—100 процантнае выкананьне пляну месячніка штурму.

З аўтыльнага ліку раёнаў, дзе праходзіць дарожнае будаўніцтва, вылучана 6 ударных рашаючых раёнаў—**Слуцкі, Мазырскі, Полацкі, Талачынскі, Менскі, і Бешанковіцкі.** Туды накіравана каля 50 фізкультурнікаў, якія прымуць актыўны ўдзел у правядзеньні месячніка.

ЦК ЛКСМБ 1 сакавіка арганізуе ўсебеларускі камсамольскі суботнік па вывазцы будаўнічых матар'ялаў для дарог.

Белдартранс накіраваў у раёны каля 100 аўтамашын для вывазкі будаўнічых матар'ялаў. За апошнюю дэкаду выпушчана з рамонту 5 машын, якія прызначаны для гэтай-жа мэты.

Да апошняга часу шмат якія раёны слаба разгарнулі работу па правядзеньні месячніка. Ня ўсюды пляны работы на дарожным будаўніцтве давядзены да двароў, ня ўсюды наладжаны вучот выхаду фурманак на работу.

Гэтыя недахопы павінны быць зжыты. (Белта).

Пакараць галавацяпаў, якія зрываюць будаўніцтва

ЖЛОБІН. (Наш кар.) Складзеныя райвыканкомам планы дарожнага будаўніцтва на 1932 г. прадугледжваюць пабудову 18 новых мастоў і капітальны рамонт 6 мастоў і 17 дарог.

Абвешчаны ЦК КП(б)Б з 15-II месячнік дапамогі дарожнаму будаўніцтву і сама вялізарнасьць пляну павінны былі ўскалыхнуць усе раённыя арганізацыі і ў першую чаргу райвыканком, але Жлобінскія арганізацыі сустрэлі пастанову ЦК КП(б)Б маўчаньнем.

Штаб па правядзеньні месячніка ня створаны. 20-II прэзыдыум РВК, абгаварыўшы пытаньне аб дарожным будаўніцтве, абвесьціў месячнік з 20-II—па 20-III, вылучыў адказным па гэтай галіне члена прэзыдыуму тав. Шандаровіча, якога... з 20-II адпусьціў у адпачынак (?!).

Жлобінскі раён павінен атрымаць і вывезьці для дарожнага будаўніцтва 1.400 куб. м. лесаматар'ялаў. Але абураючая цяганіна зрывае гэту адказнейшую работу.

З вялікімі цяжкасьцямі, пасьля недапушчальнай цяганіны атрымаў нарэшце райвыканком нарады Рагачоўскага леспрамгасу на адпуск 1.400 куб. м. лесу, але з 21-I нарады ляжаць у папках РВК з кароткімі рэзалюцыямі вучастковых лесаводаў: «Лесасечных дзялянак няма».

Адказнейшая работа па складаньні балянсаў рабочай і гужавой сілы з тым, каб у бліжэйшыя дні пасобныя насельныя пункты былі замацаваны за пэўнымі аб'ектамі дарбудаўніцтва—сельсаветамі зрываецца.

Гэтыя абураючыя факты бяздушнага бюракратызму не знайшлі адпаведнага рэагаваньня з боку райкому партыі і РККРСІ, якія павінны былі ўзначаліць правядзеньне месячніка.

Цэнтральны штаб па правядзеньні месячніка павінен прыцягнуць да адказнасьці жлобінскіх галавацяпаў.

Узначаліць правядзеньне месячніка, мабілізаваць шырокія масы для ўдзелу ў ім—такава баявая задача Жлобінскага РК КП(б)Б і ўсёй партарганізацыі раёну.

Закрэўскі.

Вышэй якасныя паказьнікі

прамысловасьці ў чацьвертым заключным

Недапусьціць зьніжэньня

Найбольш слабым месцам у рабоце прамысловасьці БССР за 1931 г. зьяўлялася, апрача колькаснага недавыкананьня прамфінпляну, абсалютна недавыкананьне выкананьне якасных паказьнікаў: прадукцыйнасьць працы, зьніжэньне сабекошту, сартовасьць і якасьць прадукцыі.

Прамфінплян 1932 г., які павінен завяршыць выкананьне пяцігодкі за чатыры гады і ад поўнага выкананьня якога цалкам залежыць пасьпяховае ўступленьне ў другую пяцігодку, патрабуе максымальнай мабілізацыі сіл і энэргіі рабочае класы, на выкананьне як якасных, так і колькасных паказьнікаў народна-гаспадарчага пляну 4-га заключнага году пяцігодкі.

Прамфінплян 1-га кварталу 1932 г. запраектаваны па прамысловасьці ВСНГБ з ростам валавой прадукцыі, супроць 1-га кварталу мінулага году, на 43,8 проц., прадукцыйнасьць працы—на 50,1 проц., зьніжэньне сабекошту—на 3,2 проц. Прамфінплян 1-га кварталу зусім рэальны, яго трэба і можна выкаць.

З усёй катэгарычнасьцю трэба паднясьціць актуальнае значэньне безагаворачнага і поўнага выкананьня прамфінпляну 1932 г. Штодзённая барацьба за асваеньне колькасных і якасных паказьнікаў, пачынаючы з 1-га кварталу мае вялікае значэньне. Пад асаблівы нагляд трэба ўзяць выкананьне якасных паказьнікаў—гэта мы яшчэ раз з усёй катэгарычнасьцю падкрэсьліваем.

Між тым, папярэднія вынікі работы прамысловасьці ВСНГБ за студзень паказваюць, што за выключэньнем скураной прамысловасьці, якая выканала плян на 105 проц., усе іншыя галіны скончылі першы месяц 1-га кварталу са значным прарывам. Швэйная прамысловасьць выканала плян на 76,6 проц., металёапрацоўчая прамысловасьць—на 71,5 проц., керамічная—на 43,3 проц., паперовая—на 62,2 проц., абутковая—на 68,9 проц., паліграфічная—на 71,4 проц. і г. д.

Цэнтральнымі неадкладнымі задачамі партыйных, прафэсыянальных і гаспадарчых арганізацый выяўляецца—дамагчыся на кожным вытворчым вучастку прадпрыемства максымальнай апэрацыйнасьці, выкананьне 6 умоў тав. Сталіна, фанучая барацьба самацёкам, коснасьцю і іншымі перажыткамі, якія стаяць на шляху выкананьня колькасных і якасных паказьнікаў і кварталу.

Рашуча змагацца з маючымі месца на асобных прадпрыемствах настроямі ў некаторых гаспадарнікаў, якія матывуюць невыкананьне колькасных паказьнікаў на студзеньскім пляне тым, што «змагаліся за якасныя паказьнікі». Процінастаўленьне якасных паказьнікаў колькасным зьяўляецца горшым відам апартунізму і нічога агульнага ня мае з установамі партыі.

Пытаньні выкананьня якасных паказьнікаў былі з усёй сілай завостраны XVII партыйнай канфэрэнцыяй. Барацьба за якасныя паказьнікі павінна стаць справай шырокіх рабочых мас.

Г.

Апэрацыйная зводка

выкананьня прамфінпляну за 1 дэкаду лютага 1932 г.

За 1 дэкаду лютага 1932 г. прадпрыемствы ВСНГБ плян выпуску валавой прадукцыі выканалі на 23,6 проц. Наперадзе ідуць наступныя прадпрыемствы, якія выканалі месячны плян за гэтыя 10 дзён у наступных колькасьцях: Гомсельмаш—37 проц., «Чырвоны адраджэнец»—35 проц., лакавы завод—43 проц., скураная прамысловасьць—33,7 проц. і ўсе пяць прадпрыемстваў, якія аб'ядноўваюць скураную прамысловасьць, шкляная прамысловасьць—36,1 проц., галянтарэйная—36,8 проц.

Адстаюць: металяапрацоўчая прамысловасьць, якая выканала за 10 дзён месячнае заданьне на 20 проц., хімічная прамысловасьць—на 29,7 проц., абутковая—на 19,7 проц.

Ганебна адстаюць: паперовая прамысловасьць, якая выканала плян на 13,6 проц., завод «Камунар»—на 10 проц., Віцебская абутковая фабрыка—на 9,6 проц., завод імя Сталіна—на 6,9 проц., «Герой працы»—на 10,9 проц. і фабрыка «Чырвоная Зорка»—на 12 проц.

33 буйнейшых прадпрыемстваў—пад сочны нагляд

Сэктар вытворчасьці і плянаваньня ЦСПОБ узяў на непасрэдны нагляд работу 33-х буйнейшых прадпрыемстваў БССР, устанавіўшы сыстэму падзённых зводак аб ходзе выкананьня імі прамфінпляну. У ліку гэтых 33-х прадпрыемстваў уваходзяць наступныя заводы:

Завод імя Ланцуцкага (Гомель), з-д «Полымя Рэвалюцыі» (Менск), Гомсельмаш (Гомель), «Чырвоны Мэталіст» (Віцебск), з-д імя Варашылава, з-д «Камунар» (Менск), «Пролетары» (Гомель), «Бальшавік» (Менск), з-д імя Сталіна (Магілёў), абутковая ф-ка (Менск), абутковая ф-ка імя Лекерта (Віцебск), абутковая ф-ка «Праца» (Гомель), Лесазавод № 13 (Віцебск), Дрэваапрацоўчы камбінат (Бабруйск), Гомельскі дрэваапрацоўчы камбінат. Лесазавод імя Молатава (Менск), ф-ка «Дзьвіна» (Віцебск), гута «Кастрычнік» (Сьвіслач), швэйная ф-ка «Кастрычнік» (Менск), швэйная ф-ка імя Валадарскага (Магілёў), швэйная ф-ка імя Дзяржынскага (Бабруйск), швэйная ф-ка «Камінтэрн» (Гомель), швэйная ф-ка «Сьцяг Індустрыялізацыі» (Віцебск), трыкатажна-панчошная ф-ка імя Клары Цэткін (Віцебск), папяровая ф-ка «Герой Працы» (Добруш), папяровая ф-ка «Спартак» (Шклоў), запалкавая ф-ка «Пралетарская Перамога» (Барысаў), запалкавая ф-ка «10 Кастрычнік» (Рэчыца), запалкавая ф-ка «Везувій» (Гомель), Дубровенскага мануфактура, пабудова шклозаводу ў Гомелі і Крычэўскі цэмэнтны завод.

Узяцьце пад асобны нагляд гэтых 33-х прадпрыемстваў, мае сваёй мэтай стала і сваячасова рэагаваць і папярэджваць магчымыя на іх прарывы.

Апрача таго, прэзыдыум ЦСПОБ даручыў сэктару вытворчасьці і плянаваньня на працягу 10 дзён прымацаваць да гэтых прадпрыемстваў членаў ЦП і гарпрафсаветаў.

Р.

Волыт змаганьня Бабруйскага гарсавету за месца ў чырвонай кнізе

Уступаючы ў сацыялістычнае спаборніцтва за месца ў «Чырвонай кнізе сацыялістычных рапартоў саветаў», Бабруйскі гарсавет ставіў перад сабой баявыя задачы: перабудаваць масавую работу гарсавету і дабіцца таго, каб дэпутацкая група на прадпрыемстве была сапраўдным актыўным змагаром за выкананьне прамфінпляну, за палепшаньне сацыяльна-бытавых умоў работы, за ажыцьцяўленьне 6 гістарычных паказаньняў тав. Сталіна. Бабруйскі гарсавет поўнасьцю прыняў праграму-мінімум сацспаборніцтва, якая была высунута газэтай «Савецкая Беларусь».

Паставіўшы ў цэнтр сваёй увагі перабудову масавай работы, узмацненьне лепшых ударнікаў вытворчасьці ў работу сэкцый дэпутацкіх груп—гарсавет на сёньняшні дзень мае канкрэтныя вынікі сваёй работы.

Да ўступленьня ў сацыялістычнае спаборніцтва пры гарсавеце існавала 10 сэкцый пры чым работа іх была разгорнута недастаткова. Некаторыя сэкцыі, як напрыклад бытавая, зусім не працавалі. У работу сэкцый была ўцягнута недастаткова колькасьць рабочых-ударнікаў і спэцыялістаў, адсутнічала плянавасьць у іх рабоце. Дэпутацкія групы знаходзіліся толькі ў стадыі свайго арганізацыйнага афармленьня і ніякай практычнай работы не праводзілі. **На сёньняшні дзень на прадпрыемствах гораду Бабруйску існуе 22 дэпутацкія групы, якія аб'ядноўваюць звыш 1.500 чал. савецкага актыву з рабочых-ударнікаў, спэцыялістаў і працоўных гораду.** Працуе 14 сэкцый. У часе ходу спаборніцтва арганізаваны 4 новых сэкцыі: **грамадзкага харчаваньня, транспарту і сувязі, арганізацыйна-масавая, адміністрацыйна-прававая. У рабоце сэкцый удзельнічае, разам з савецкім актывам, звыш 1.000 чал.**

Рашучым чынам перабудавана работа сэкцый. У работу іх уведзена строгая плянавасьць і работы іх перабудаваны на основе брыгаднага мэтаду. Сэкцыі і бюро дэпгруп займаюцца вырашэньнем найактуальнейшых пытаньняў сёньняшняга дня. Так, сэкцыя **грамадзкага харчаваньня** разгарнула шырокую работу за ажыцьцяўленьне санітарнага мінімуму ва ўстановах грамадзкага харчаваньня і бытавых установах, за палепшаньне якасьці работы сталовак, яна правяла абсьледаваньне ўсіх сталовак, устанавіла бракераж абедаў, правяла канфэрэнцыю работнікаў кухні і кухароў.

Значную работу правяла **сэкцыя** аховы здароўя ў галіне аздараўленьня быту рабочых на прадпрыемствах, у галіне барацьбы за санітарны мінімум і чыстату гораду. Арганізаваны здраўпячэйкі на ўсіх буйных прадпрыемствах. Для ўсіх прадпрыемстваў устаноўлены санітарны мінімум, вылучана звыш 20-ці грамадзкіх санінспэктароў, праведзены абгляд выкананьня прадпрыемствамі і ўстановамі санмінімуму. У работу гэтай сэкцыі ўцягнута звыш 40 мэдспэцыялістых.

У ходзе сацспаборніцтва шырока разгарнула сваю работу **сэкцыя РСІ,** якая трымае самую цесную сувязь у сваёй рабоце з райКК РСІ. Члены сэкцыі прымаюць актыўны ўдзел ва ўсіх масавых агглядах і праверках, якія праводзяцца па лініі райКК РСІ. Імі праведзены агляд раду арцелеў сампрамсаюзу з мэтаю мабілізацыі працоўных у арцелях на барацьбу за якасьць прадукцыі і за зьнішчэньне браку. Сэкцыя рабочага забесьпячэньня правяла значную работу ў галіне праверкі цэн, барацьбы з чаргамі, барацьбы за палепшаньне якасьці хлеба і забясьпечаньні ім працоўных гораду.

Значнейшую ўвагу ў барацьбе за выкананьне задач, пастаўленых умовамі спаборніцтва за месца ў **«Чырвонай кнізе»** Бабруйскі гарсавет аддаў разгортваньню сацсумяшчальніцтва, стварэньню належных умоў для работы сац. намесьнікаў. У выніку перабудовы гэтай работы кожны старшыня сэкцыі зьяўляецца сац. намесьнікам загадчыка адпаведнага аддзелу альбо інспэктарыяту гарсавету і гарадзкіх устаноў. Мы маем прыклады сапраўды баявой работы сацнамесьнікаў. **Т. Нодае** сваёй рабоце па сацнамесьніцтву значную ўвагу. Дзякуючы яго актыўнасьці, выяўлена звыш 60-ці пакоеў, забясьпечаны кватэрамі рад рабочых. Па ўдарнаму праводзяць сваю работу сацнамесьнікі **т. Сусар**—рабочы швэйнай фабрыкі, **т. Ліўшыц**—рабочы маляр і г. д.

Для ўцягненьня ў работу гарадзкога савету рабочых-ударнікаў і працоўных гораду была шырока скарыстана справаздачная кампанія гарадзкога савету. У выніку яе ўцягнута ў работу гарсавету звыш 600 рабочых-ударнікаў і звыш 50 спэцыялістых у работу сэкцый і дэпутацкіх груп.

Ставячы сваёй задачай узьняцьце палітычнага ўзроўню савецкага актыву, гарадзкі савет практыкуе прапрацоўку важнейшых дырэктыў партыі і ўраду на пленумах сэкцый. Так былі прапрацаваны 8-ю сэкцыямі пастановы 2 сэсіі ЦВК БССР, сэсіі ЦВК СССР і лист т. Сталіна. Распачата прапрацоўка пастаноў XVII Усесаюзнай партканфэрэнцыі.

Мэты і задачы сацспаборніцтва за месца ў «Чырвонай кнізе» шырока папулярызаваны сярод савецкага актыву. Было аклікана некалькі нарад па гэтым пытаньні, выдана спэцыяльная памятка савецкага актывіста па ўдзеле ў спаборніцтве, праграма-мінімум прапрацавана асобнымі сэкцыямі. Разам з гэтым трэба адзначыць ініцыятыву гарадзкога савету ў выданьні спэцыяльных макетаў насьценгазэт-трохдзёнак **«Савецкі актывіст».** Па радзе прадпрыемстваў гэтыя трохдзёнкі выходзяць рэгулярна, мабілізуючы масы савецкага актыву, і рабочых-ударнікаў на актыўны ўдзел у рабоце дэпутацкіх груп, а разам з гэтым і за выкананьне задач спаборніцтва за месца ў **«Чырвонай кнізе».**

Перабудова масавай работы гарадзкога савету ў напрамку набліжэньня яе да цэха, брыгады і групы ў значнай ступені садзейнічала ўзьняцьцю барацьбы рабочых-ударнікаў за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну. Арганізавана 8 сац. гаспразьліковых брыгад імя **«Гарадзкога савету»,** якія па бальшавіцку змагаюцца за выкананьне прамфінпляну. Так брыгада імя «Гарсавету» фанернага цэху камбінату выканала свой прамфінплян на 112 проц. і прэміравана гарсаветам. Дэпутацкая група швэйнай ф-кі вядзе актыўную барацьбу за ліквідацыю прарыва ў выкананьні прамфінпляна, мабілізуючы на выкананьне яго масы рабочых. Ёю вылучана спэцыяльная брыгада па барацьбе за якасьць прадукцыі.

Работа гарадзкога савету ў галіне выкананьня прамфінпляну яскрава характарызуецца выкананьнем яго асобнымі прадпрыемствамі, так за студзень на белцэху камбінату экспартны плян выкананы на 102,8 проц., пры выкананьні агульнага пляну на 107 проц., па фанерным цэху экспартны плян выкананы на 106 проц., па лесацэху камбінату на 106,6 проц., па фабрыцы **«Чырвоны харчавік»** на 109,6 проц., **фанзаводу**—108 проц., **лесазаводзе № 7**—101,5 проц. Гэтых дасягненьняў прамысловасьць Бабруйску дабілася дзякуючы правільнаму кіраўніцтву партыйнай і прафсаюзнай арганізацыі, дзякуючы мабілізацыі актыўнасьці працоўных мас, дзякуючы разгортваньню сацспаборніцтва і ўдарніцтва, укараненьню ў работу прадпрыемстваў 6-ці гістарычных паказаньняў т. Сталіна, дзякуючы павароту гарадзкога савету тварам да вытворчасьці.

У выніку актыўнай барацьбы гарадзкога савету за выкананьне пляну фінансаваньня III-га рашаючага году пяцігодкі, плян быў выкананы з перавышэньнем на 4 проц. У гэтым прымала актыўны ўдзел фінансава-бюджэтная сэкцыя гарадзкога савету, якая правядзеньнем шырокай растлумачальнай работы значна дапамагала камсаду і г. д.

У галіне ажыцьцяўленьня пастаноў партыі аб перабудове гарадзкой гаспадаркі гарсаветам праведзены мерапрыемствы па ўпарадкаваньні ў карыстаньні жыльлёвай плошчы, разгрузьбуйненьню жактаў, заканчваецца будаўніцтва дому-калектыву на 186 кватэр. У бягучым 1932 годзе будзе закончана будаўніцтва тэатру і больніцы. Рост бюджэту на камунальныя патрэбы ў параўнаньні з мінулым годам большы, як у 3 разы (замест 222.000 у 1931 г. да 815.000 руб. у 1932 г.).

У галіне ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі, аб палепшаньні рабочага забесьпячэньня, перабудове рабочай капэрацыі і разьвіцьці савецкага гандлю плян адкрыцьця новых магазынаў па горадзе перавыкананы, пабудавана фабрыка-кухня, заканчваецца пабудова савецкага базару.

Бабруйскі гарсавет дабіўся дасягненьняў у рэалізацыі пастановы ЦК аб школе. Школамі ахоплена 6270 дзяцей. Адна школа рэарганізавана ва ўзорную, рэарганізаваны ва ўзорны адзін дзіцячы дом, школамі і гурткамі ахоплена 100 проц. няпісьменных. Значна палепшаны сацыяльны склад камсадаў, школ з агульнага ліку членаў іх 290 чалавек—200 зьяўляюцца рабочымі ад станка.

У галіне наладжваньня штодзённага кіраўніцтва [illegible] перабудове вёскі, гарсавет мае бязумоўныя посьпехі: арганізавана шырокая папулярызацыя задач конкурсу **«Правды».** Гарадзкі савет уключыўся ў правядзеньне гэтага конкурсу. Сэкцыя прыгараднай гаспадаркі абсьледавала падрыхтоўку да сяўбы на гэтай гаспадарцы, заслухала даклад прыгараднай гаспадаркі аб падрыхтоўцы да сяўбы на пленуме гарадзкога савету. Сэкцыя аховы здароўя вылучыла брыгаду з 7 асоб, якая ўключылася ў практычную дапамогу калгасу **«Чырвоная Бярэзіна»** па падрыхтоўцы да сяўбы. Дэпутацкія групы швэйнай фабрыкі, заводу імя Варашылава, фанэрнага заводу выслалі на вёску свае брыгады для ўдзелу ў конкурсе нізавога друку, абвешчанага **«Правдой».**

Гарсавет уключаў у дагавор спаборніцтва за месца ў **«Чырвонай кнізе»** пункт аб разгортваньні вайсковай работы, узмацненьне сувязі з Чырвонай арміяй. У гэтай галіне гарсавет мае наступныя дасягненьні: значна ўзарасла асаавіяхімаўская арганізацыя, для лепшых ячэек АСО ўстаноўлены гарсаветам пераходны сьцяг за лепшую пастаноўку вайсковай работы. Значная работа праведзена ў адносінах палепшаньня бытавых умоў начскладу гарнізону (прадстаўленьне кватэр, большы ахоп дзяцей кам. паліт. складу дзіцячымі ўстановамі і г. д.), прыступлена да пабудовы новага стралковага ціру.

Такавы практычныя рэзультаты барацьбы Бабруйскага гарсавету за месца ў **«Чырвонай кнізе саветаў».** Але разам з гэтымі дасягненьнямі ў рабоце гарадзкога савету і на сёньняшні дзень ёсьць яшчэ рад істотных недахопаў, якія неабходна зараз-жа лікв

Важнейшым звяном у арганізацыі працы у калгасах павінна стаць брыгада (ЦК УсеКП(б))

Калгасная штодзёнка ў барацьбе за бальшавіцкі ўраджай

(Штодзёнка калгасу імя Варашылава „За сьцяг „Правды“

Нізавы друк у калгасах, саўгасах ў выніку разгортваньня конкурсу «Правды» вырас у магутную сілу. Калі да часу конкурсу ў нашым раёне насьцен газэта ў калгасе была рэдкім зьявішчам і выпуск гэтых газэт прыстасоўваўся толькі да рэвалюцыйных сьвят, дык па сёньняшні дзень дзесяткі калгасаў уключыліся ў конкурс «Правды» і маюць свае добрыя, рэгулярна выходзячыя, штодзёнкі. Ударнікі-калгасьнікі, ажыцьцяўляючы лёзунг «кожны рабсялькор-ударнік, кожны ўдарнік-рабсялькор», разгарнулі шырокую арганізуючую работу па наладжваньні выпуску штодзёнак і трохдзёнак. Па калгасах і саўгасах раёну налічваецца штодзёнак і трохдзёнак каля 10, прычым лік іх з кожным днём расьце і расьце.

Але колькасьць ня ўсё вырашае. Патрэбна якасьць. Бяз якасьці ня можа лічыцца газэта магутнай зброяй ў барацьбе за генэральную лінію партыі.

Слова канкрэтным прыкладам:

Інтэрнацыянальны калгас імя Варашылава Сялецкага сельсавету зьяўляецца перадавым калгасам у раёне па выкананьні гаспадарча-палітычных кампаній. Калгас першым уключыўся ў конкурс «Правды» па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў. Калгасьнікі-ўдарнікі, уключыўшыся ў конкурс «Правды», узялі на сябе абавязак зараз-жа наладзіць выпуск штодзённай насьцен-газэты. Яны і тут праяўляюць бальшавіцкую вдольнасьць перадавікоў у барацьбе за задачы пастаўленыя перад імі партыяй. Свой абавязак калгасьнікі ажыцьцяўляюць.

5-га сьнежня ўпоўабраная рэдкалегія выпускае першы нумар штодзённі «За сьцяг «Правды». Па вытлядзе нумар ні чым не выдаецца. У нумары ёсьць шмат граматычных памылак. Але зьмест газэты паказвае газэту, як сапраўднага барацьбіта за пасьпяховае ажыцьцяўленьне задач партыі па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

З першага нумару газэта «За сьцяг «Правды» па бальшавіцку мабілізуе калгасьнікаў на выкананьне чарговых задач калгасу. Тут-жа ў нумары адзначаюцца лепшыя барацьбіты ўдарнікі-калгасьнікі, выкрываюцца гультаі, лодыры, прагульшчыкі.

Перадавіца «За сьцяг «Правды» пры сьвечваецца падвядзеньню вынікаў выкананьня гаспадарча-палітычных задач і мабілізуе калгасьнікаў на выкананьне чарговых задач. Газэта піша:

«Усе гаспадарча-палітычныя кампаніі ў асноўным скончаны. Пляны заготовак выкананы і перавыкананы. Плян бульбазагатовак выкананы на 150 проц., сена—замест 2 тон здадзена—5 тон. Плян збожжазагатовак выкананы на 130 проц., плян ўкамплектаваньня цялятніка выкананы на 200 проц. Выкананы і плян па садкі саду».

«Але ня гледзячы на гэта ў нас ёсьць прарыў у галіне абвязкі саду. Сад патрабуе тэрміновай абвязкі. Калгасьнікі ў гэтым напрамку адстаюць. Некаторыя ня выходзяць на працу, абвязка ідзе марудна».

На гэтым штодзёнка варашылаўцаў не супакойваецца. Яна добра зразумела пастаўленыя партыяй задачы па спэцыялізацыі сельскае гаспадаркі. Барацьба газэты за захаваньне 15-га насаджанага саду разгортваецца далей. У трэцім нумары газэта зноў уздымае пытаньне аб узмацненьні тэмпаў абвязкі саду. Тут-жа выкрываюцца канкрэтныя зрыўшчыкі.

«—У нас ідзе ўдарная работа па абвязцы саду, а камсамолка Ляшчынская ня выходзіць на працу».

Зараз паглядзім, якіх-жа вынікаў дабілася газэта. Сьцягалы штодзённі праўленьне калгасу адразу пачула. Вынікі атрымаліся бліскучыя.

Назаўтра пасьля зьмяшчэньня матар'ялаў была вылучана спэцыяльная брыгада па абвязцы саду, якая работу скончыла за 5 дзён. Сад добра захаваны на зіму.

Ня меншую барацьбу разгарнула штодзёнка варашылаўцаў за жывёлагадоўлю, за рацыянальнае скарыстаньне кармоў. Зьмест 4 і 5 нумараў штодзённі яскрава паказвае гэтую барацьбу. Гэтыя нумары перапоўнены матар'ялямі і фактамі, якія гавораць аб тым, што ў калгасе ёсьць факты нерацыянальнага скарыстаньня кармоў, разбазарваньня іх і дрэннага догляду за жывёлай, асабліва за коньмі. Па бальшавіцку штодзёнка ўвязвае гэта з надыходзячай трэцяй бальшавіцкай сяўбой.

У допісе пад назвай «Праўленьне агхнімся» газэта піша:

«Ёсьць выпадкі, калі калгасьнікі на ноч бяруць па некалькі пудоў сена коням бяз нормы і бяз ведама гаспадарніка і разбазарваюць яго... Да веснавой пасеўкампаніі можам застацца бяз фуражу».

У другім допісе «За сьцяг «Правды» сьцягвізуе аб новых фактах разбазарваньня кармоў і незацікаўленасьці асобных калгасьнікаў у эканомным скарыстаньні кармоў. Газэта выступае па гэтым пытаньні з заметкай наступнага зьместу:

«Забясьпечыць цялятам цёплыя памяшканьні. Па ацяпленьні памяшканьня для цялят, праведзена значная работа, але ёсьць і недахопы... Няма яшчэ кармушак. Сена, дзякуючы гэтаму, раскідваецца... Ня поўнасьцю скончана работа па ацяпленьні хлява».

Газэта патрабуе ў бліжэйшыя 2-3 дні адрамантаваць дзьверы ў цялятніку, поўнасьцю скончыць ацяпленьне і зрабіць кармушкі. Патрабаваньні ажыцьцяўляюцца. Праз тры дні ў цялятніку пабудаваны кармушкі, адрамантаваны дзьверы.

Трэба адзначыць значныя дасягненьні штодзёнкі варашылаўцаў і ў барацьбе за захаваньне цягавай сілы. Матар'ялы, прысьвечаныя гэтаму пытаньню і эканомнаму скарыстаньню кармоў ня сходзяць са старонак штодзённі. Штодзёнка выступае з матар'ялам пад загалоўкам «Больш увагі коням». У допісу пішацца:

«Ня раз гаварылася на нарадах ў праўленьнях калгасу аб падрыхтоўцы цягавай сілы да трэцяй бальшавіцкай вясны. Але калі зойдзеш на стайню, дык адразу відаць, што гэтыя пастановы ня выконваюцца. Коні стаяць без станкоў, зачыняюцца ў пуні па некалькі штук, кармушак таксама няма, сена трапляе пад ногі коням і топчацца ў гной».

Рэдкалегія штодзёнкі ставіць пытаньне перад праўленьнем аб прыняцьці тэрміновых мер патрабуе неадкладна зрабіць станкі і кармушкі.

Штодзёнка дабіваецца правядзеньня ў жыцьцё пачатай справы. Праз некалькі дзён праўленьне прыняла меры да рамонту і пабудовы станкоў і кармушак. Коні былі расстаўлены ў памяшканьні і разьбіты на 2 групы: лепшыя і горшыя, з тым, каб лепшых,

Рабкор-ударнік, рабочы саўгасу «Добрань» т. АНТАШОНАК.

якія больш працуюць,—лепш карміць. У выніку такой работы палепшыўся догляд за конскай цягавой сілай. У калгасе праводзіцца баявая падрыхтоўка коняй да сяўбы.

Аднак ёсьць у рабоце газэты «За сьцяг «Правды» яшчэ і недахопы. Газэта не змагла прыцягнуць да ўдзелу сваёй рабоце шырокія масы калгасьнікаў. Наглядаецца перабоі ў штодзённым выпуску. Недастаткова разгорнута папулярызацыя прыкладаў лепшай пастаноўкі работы асобных калгасьнікаў і брыгад.

У далейшым асноўнай задачай штодзённі зьяўляецца ўпартая барацьба за своячасовую падрыхтоўку і правядзеньне веснавой пасеўнай кампаніі, разгортваньне сапраўднай бальшавіцкай барацьбы за практычную рэалізацыю шасьці умоў тав. СТАЛІНА ва ўсёй рабоце калгасу.

А. Сянкевіч.

У авангардзе падрыхтоўкі да сяўбы

(КАМУНА ІМЯ БВА, ЛЮБАНЬСКАГА РАЁНУ).

На пясчаных Мар'інскіх балотах у 1929 г. арганізавана камуна імя БВА. Арганізатарамі камуны былі 7 дэмабілізаваных чырвонаармейцаў 14-кай кавалерыйскай дывізіі. З гаспадаркі, якая мела 7 коняй, 5 кароў і маленькую хатку, за 2 з пал. гады камуна вырасла ў буйную сацыялістычную гаспадарку. Зараз у камуне налічваецца 505 чалавек. У гаспадарцы ёсьць 427 кароў, 314 сьвіней, 96 коняй, 6 трактароў, 3 грузавых аўтамабілі, 4 снопавязалкі і інш. с.-г. машыны.

Уся гаспадарка камуны вядзецца планава і разьбіта па асобных галінах — паляводзтва, жывёлагадоўля, прамысловасьць, будаўніцтва і г. д. У камуне арганізаваны пастаянныя брыгады, на чале са старшым брыгадзірам. Прынцып пастаяннасьці брыгад не парушаецца. Калі патрэбны людзі для дапамогі ў тэрміновай работе адной з брыгад (малацьба, перавоз матар'ялаў і інш.) на гэта перакідваюцца на поўны час людзі з другой брыгады.

Усе брыгады рэгулярна праводзяць вытворчыя нарады пад кіраўніцтвам брыгадзіра, на гэтых нарадах памячаюцца пляны работ на тыдзень, ацэньваюцца рэзультаты праробленай работы, выпраўляюцца недахопы ў рабоце як усёй брыгады, так і асобных брыгадзіраў. Старшыя галін гаспадаркі вядуць дакладны вучот выдаткаваньня матар'ялаў і рабочай сілы і штодзённа даюць зьвесткі аб праробленай рабоце. Штотыдня савет камуны склікае нараду брыгадзіраў, дзе зводзяць да аднаго іх планы і складаюць дакладныя каляндарныя пляны работ.

Усе работы ў камуне пераведзены на зьдзельшчыну. У зьвязку з конкурсам нізавога друку на лепшую работу, паміж камунарамі разгорнута сацпаборніцтва і ўдарніцтва, якое захапіла на 60 проц. камуну і перакінулася ў суседнія саўгасы і калгасы.

Камунары добра зразумелі 6 гістарычных умоў тав. Сталіна. Гэтыя ўмовы пакладзены ў аснову работы па ўсіх галінах гаспадаркі. Камунары змагаюцца за якасныя паказьнікі работы.

Па ініцыятыве канторы арганізавана апчадкаса: ужо ў ёй налічваецца 50 укладчыкаў з агульнай сумай 1400 рублёў.

Камуна ўдарна рыхтуецца да сяўбы. Ужо складзены і абгавораны вытворча-фінансавы пляны, складзены кармовыя фонды: сена—28 тыс. пуд., сілосу—700 тон, падрыхтавана насеньне канапель 2.500 пуд., аўса—3.000 пуд., грэчкі—600 пуд., бульбы—12.000 пуд. і завозіцца сартовае насеньне. Пляны сяўбы складзены і абгавораны на паседжаньні савету і сходзе камунараў. Сёлета камуна пад яравы клін мяркуе засеяць плошчу ў 1.397 га. У мінулым годзе было засеяна канапель 96 га, а ў гэтым годзе мяркуецца засеяць 400 га. Таксама будзе засеяна аўса 200 га, нікі—12 га, гароху—12 га, проса—22 га, сілосных культур—50 га, каральплодаў—68 га і гародніны—146 га. Трактары і машыны адрамантаваны, заканчваецца рамонт дробнага с-г інвэнтару.

Абавязак перад дзяржавай у здачы (продажы) усіх відаў загатовак камуна выканала цалкам. Камунары добра зразумелі справу вывучаньня тэхнікі і агратэхнікі, у камуне ёсьць 43 сваіх спэцыялістаў (трактарысты, шафёры, электраманцёры, зоотэхнікі, паляводы, жывёлаводы і інш.). Пры камуне арганізуюцца курсы па аўладаньні тэхнікай, куды прыцягваюцца калгасьнікі суседніх калгасаў.

Так пасьпяхова вырасла камуна імя БВА. Так змагаюцца камунары за бальшавіцкую падрыхтоўку да сяўбы чацьвертага заключнага году пяцігодкі.

С. Гусеў.

Рэалізацыя пастановы ЦК УсеКП(б)— аснова пад ыхтоўкі да сяўбы

РАГАЧОЎ. Калгас «Шлях Леніна» па ўдарнаму разгарнуў падрыхтоўку да сяўбы і праводзіць яе на аснове рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) ад 4-га лютага пра арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

Пастанова ЦК распрацавана на агульным сходзе калгасьнікаў. Уся рабочая сіла калгасу разьбіта на брыгады. Брыгадам даручаны пасобныя вучасткі працы: вывазка гною, завоз штучнага ўгнаеньня, рамонт інвэнтара і інш.

Калгас поўнасьцю закончыў засыпку насеннага фонду, па ўдарнаму праводзіцца ачыстка насеньня, заканчваецца рамонт с.-г. інвэнтара і машын.

Калгас надаў належную ўвагу падрыхтоўцы да сяўбы конскай цягавой сілы: да кожнага каня падрыхтавана збруя, коні падзелены па групах у залежнасьці ад работы, якую яны будуць выконваць. Да кожнай групы прымацаваны пастаянныя канюхі. На час сяўбы створан каня для коняй спэцыяльны фуражны фонд.

Калгас выклікаў на сацпаборніцтва па лепшай падрыхтоўцы да сяўбы і па лепшай рэалізацыі дырэктывы партыі пра арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў—калгасы «1—мая» і імя Сталіна. (Белта).



Проба адрамантаванага трактару.

Аб кантрактацыі яравых зярнёвых, бабовых і масьлічных культур ураджаю 1932 г.

Пастанова Савету Працы і Абароны

Савет Працы і Абароны пастанаўляе:

1. Устанавіць плян кантрактацыі зярнёвых, бабовых і масьлічных культур у калгасах і бядняцка - серадняцкіх аднаасобных гаспадарках у разьмеры 56.212 тыс. га, у тым ліку:

а) па зярнёвых і бабовых культурах — 51.162 тыс. га, з іх:

пшаніцы	20.978 тыс. га
аўса	12.972 „ „
ячменю	5.275 „ „
крупяных	5.281 „ „
кукурузы	3.331 „ „
бабовых	1.974 „ „
рысу	158 „ „
нікі на зярнё	900 „ „
яравога жыта і інш.	291 „ „

б) па масьлічных культурах 5.050 тысяч га, з іх:

клешчаніку	4.500 тыс. га
соі	310 „ „
слешчавіны	240 „ „

2. У ліку 56.212 тыс. га закантрактаваць сартовых пасеваў 1.500 тыс. га.

3. Кантрактацыю яравых пасеваў зярнёвых і масьлічных культур у калгасах і аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках уключаюцца на «Загатзярнё».

4. Кантрактацыя сартавога зярня ўтвараецца Саюзнасеннаводам выключна ў насеннаводных калгасах, сыпісы якіх зацьвярджаюцца на мясцох рэспубліканскімі, краёвымі і абласнымі ўпаўнаважанымі Камітэту па загатоўках пры СПА.

5. У калгасах, абслугоўваемых МТС, як «Загатзярнё», так і Саюзнасеннавод ажыцьцяўляюць кантрактацыю праз МТС. Для гэтага «Загатзярнё» і Саюзнасеннавод заключаюць адпаведныя генэральныя дагаворы з праўленьнем Трактарацэнтру, а іх мясцовыя філіялы — лёкальныя дагаворы з МТС.

6. Пасевы ў кулацка - заможных гаспадарак не кантрактуюцца. Загатоўкі збожжа і масьлічных культур у гэтых гаспадарках праводзяцца ў парадку цьвёрдых заданьняў.

7. Нормы здачы (продажу) калгасамі закантрактаванай прадукцыі зярнёвых культур (з разьліку сярэдняга ўраджаю) у разьмеры ад ¼ да ½ валавога збору ў асноўных зярнёвых раёнах, а таксама ў вытвараючых зярнёвых раёнах іншых абласьцей і ня больш ¼ валавога збору ў незярнёвых раёнах.

8. Нормы здачы (продажу) закантрактаванай прадукцыі зярнёвых культур, уключаючы кукурузу, для аднаасобных гаспадарак устанавіць у разьмерах, паказаных у арт. 7, з тым, аднак, каб колькасьць зярня, падлягаючага здачы (продажу) аднаасобнікамі-кантрактантамі з аднаго га (у цэнтнерах), было ня менш колькасьці, здаваемай з аднаго га адпаведных культур бліжэйшым калгасам.

9. Устанавіць норму здачы (продажу) як для калгасаў, так і для аднаасобных кантрактантаў: па бабовых культурах — ня менш 50 проц. валавога збору, па рысе, сланечніку, соі і віке—ня менш 70 проц. валавога збору, па клешчавіне — ня менш 80 проц. валавога збору ўраджаю.

10. Закантрактаваная прадукцыя зярнёвых і масьлічных культур павінна быць здана (прадана) не пазьней чым на працягу 3-х месяцаў з моманту пачатку ўборкі ўраджаю.

11. Прыняць да ведама, што Дзяржбанк адпускае для грашовага фінансаваньня кантрактантаў па бабовых культурах, кукурузе, рысе, сланечніку, соі і клешчавіне — 45,5 млн. руб., у тым ліку для авансаваньня кантрактацыі сартавых пасеваў — 3 млн. руб.

12. Устанавіць насупротьня сартавых надбавкі за кожны цэнтнер здаваемай калгасамі закантрактаванай прадукцыі зярнёвых і масьлічных культур (пры сартавой чыстаце ня ніжэй 95 проц.): па пшаніцы — 30 кап., па бабовых—60 кап., па рысе — 1 р. 50 кап., па ячмені і аўсу — 20 кап., сланечніку, соі і клешчавіне — 40 кап., па кукурузе ня ніжэй 2 катэгорыі — 20 кап.

Даручыць Камітэту па загатоўках пры СПА устанавіць разьмер дадатковых насеннаводных надбавак на насеннаводнае сартавое зярнё, загатаўляемае па лініі Дзярсортфонду.

13. Устанавіць выдачу (продаж) алею і жмыха супроць цэнтнера здаванага (прададага) насеньня:

а) калгасам: па сланечніку і соі—2 кгр. алею і 4 кгр. жмыху, з па клешчавіне 3,5 кгр. алею і 5 кгр. жмыху;

б) аднаасобным бядняцкім і серадняцкім гаспадаркам: па сланечніку і соі — 1,5 кгр. алею і 3 кгр. жмыху, а па клешчавіне — 2,5 кгр. алею і 4 кгр. жмыху.

Апроч таго, устанавіць выдачу (продаж) здатчыкам клешчавіны мыла ў разьмеры 2 кгр. супроць 1 цэнтнера здаванага насеньня.

За здачу клешчавіны раней тэрмінаў, устаноўленых для скончэньня здачы, устанаўляецца прэмія ў відзе дадатковай выдачы (продажу) як калгасам, так і аднаасобным здатчыкам жмыху ў колькасьці 1 кгр. за кожны зданы цэнтнер насеньня клешчавіны.

14. Адпусьціць для забясьпечаньня (продажу) здатчыкам рысу 11 тыс. тон збожжа, і здатчыкам соі 6,3 тыс. тон збожжа, з іх выдаць авансам пры правядзеньні кантрактацыі пасеўшчыкам рысу 1.500 тон і пасеўшчыкам соі 1.200 тон збожжа.

15. Абавязаць НКЗем СССР забясьпечыць своячасовае і поўнае правядзеньне ўсіх агранамічных мерапрыемстваў у адносінах закантрактаваных пасеваў яравых, зярнёвых, бабовых і масьлічных культур.

16. Прапанаваць Камітэту па загатоўках пры СПА зацьвердзіць тыповыя дагаворы аб кантрактацыі яравых пасеваў зярнёвых, бабовых і масьлічных культур.

17. Тэрмінам скончэньня кантрактацыі яравых пасеваў зярнёвых, бабовых і масьлічных культур устанавіць 1 мая 1932 г.

Прапанаваць СНК Саюзных і аўтаномных рэспублік, краёвым і абласным выканкомам забясьпечыць скончэньне кантрактацыі ў указаны тэрмін.

Старшыня Савету Працы і Абароны
В. Молатаў (Скрабін).

Сакратар Савету Працы і Абароны
І. Мірошнікаў.

Масква, Крэмль,
21 лютага 1932 г.

За моцную сталую калгасную брыгаду, за правільную арганізацыю працы

Пастанова ЦК КП(б)Б аб чарговых мерапрыемствах па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў

ЦК указвае ўсім партыйным арганізацыям, што «задача арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў зьяўляецца ў цяперашні час перш за ўсё задачай разьвіцьця і ўмацаваньня арцельнай формы калгасу. Пры гэтым ЦК выходзіць з таго, што спробы шучнага паскарэньня пераходу ад арцельнай формы калгасаў да камуны на цяперашні стадыі разьвіцьця калгасу зьяўляецца сур'ёзнай небясьпекай. Супроць гэтай небясьпекі перасковаваньня праз форму с. г. арцеляй, якая яшчэ не разгорнута выстарчальна і не замацавана, ЦК папярэджвае ўсе партыйныя арганізацыі» (З пастановы ЦК УсеКП(б) ад 4-II—32 г.).

Ня гледзячы на рад указаньняў і пастаноў лістападаўскага аб'яднанага пленуму ЦК аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, практычнае ажыцьцяўленьне гэтай важнейшай задачы ідзе нездавальняюча.

Рад партыйных арганізацый, калгасных і зямельных органаў замест практычнай работы за правільную арганізацыю працы, ліквідацыю абязьлічкі, выяўленьня і выхаваньня актыву, абмяжоўваецца агульнымі фразамі і пастановамі.

Выходзячы з указаньняў ЦК Усе КП(б) ад 4-II аб чарговых задачах па арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў, ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. У цэнтр увагі партыйных, калгасных і зямельных органаў ЦК ставіць барацьбу за правільную арганізацыю працы і поўную ліквідацыю абязьлічкі, як рашаючыя мерапрыемствы ў справе арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Важнейшым зьвяном у арганізацыі працы ў калгасах зьяўляецца правільна пабудаваная вытворчая брыгада, як асноўная вытворчая адзінка ў калгасе.

Асуджаючы маючуюся ў радзе месц практыку арганізацыі брыгад па тэрытарыяльным прынцыпе (так званых брыгад-дворак) і брыгад з непастаянным складам, ЦК прапануе ліквідаваць гэткія брыгады і на аснове галавога вытворчага пляну калгасаў і ўліку патрэбнасьці ў рабочай сіле, арганізаваць ва ўсіх калгасах брыгады выключна па вытворчым прынцыпе з пастаянным складам брыгад з тым, каб, як правіла, такія брыгады выконвалі ўсе асноўныя с. г. работы на працягу ўсяго году на поўных вучастках. Стварэньне такіх брыгад не павінна, аднак, выключаць магчымасьці замацаваньня за брыгадамі вучастка́ў (у залежнасьці ад мясцовых умоў, разьмеру калгасу і яго арганізаванасьці), не на ўвесь с. г. сэзон, а толькі на асобныя пэрыяды с. г. работ (ворыва, уборка).

Калгасны склад брыгад устанаўляецца, выходзячы з вытворчага заданьня калгасу, норм выпрацоўкі і тэрміноў выкананьня работ па пэрыядах.

Кожнай вытворчай брыгадзе, як у галіне жывёлагадоўлі, так і паляводзтва павінна давацца на аснове галавога вытворчага пляну калгасу вытворчае заданьне на ўвесь год, або сэзон работы. У заданьні абавязкова павінна быць указана: аб'ём работы, ацэнка работы ў працаднёх, спіс жывёлы, інвэнтара, тэрміны выкананьня, разьмер выхаду прадукцыі ў цэнтнерах, літрах, штуках і інш.

Брыгада адказвае за выкананьне работы ў тэрмін і за ўстаноўлены выхад прадукцыі.

2. Работа брыгад па асобных галінах гаспадаркі можа быць арганізавана наступным парадкам:

У галіне жывёлагадоўлі

Брыгада замацоўваецца на пастаянную работу па даглядзе за жывёлай (брыгада па сьвінагадоўлі, па буйнай рагатай жывёле). Брыгада атрымоўвае ад праўленьня калгасу вытворчае заданьне па жывёлагадоўлі на ўвесь год і нясе поўную адказнасьць за выкананьне данага вытворчага заданьня. Унутры брыгады ва калгасьнікамі і ўдзельнікамі замацоўваецца пэўны лік жывёлы і ўстанаўляецца для кожнага віду работ расцэнка адзінкі работы і абавязковыя якасныя паказьнікі. Ацэнка работы жывёлагадоўчай брыгады і калгасьнікаў, уваходзячых у брыгады, павінна ўтварацца ў залежнасьці ад вынікаў іх работы (колькасьць надоенага малака, прырост вагі маладняка, разьмер прыплоду і інш.).

Пры перавыкананьні брыгадай гадавога заданьня па выхадзе прадукцыі, брыгада павінна атрымліваць дадатковую аплату за атрыманую звыш плянавага заданьня прадукцыю: так, за кожны атрыманы звыш вытворчага заданьня цэнтнер малака—2 працадзён, за выгадаванае парасё—5 працадзён, за кожнае цялё—10 працадзён.

Пры невыкананьні заданьня па выхадзе прадукцыі робіцца зьніжэньне ў такіх-жа разьмерах за кожную адзінку неатрыманай прадукцыі.

У галіне паляводзтва

За брыгадай замацоўваюцца сталыя зямельныя вучасткі з пасобнымі культурамі, альбо групай культур. На замацаваных за брыгадай вучастках брыгада павінна пачынаць і заканчваць ўсе працэсы с.-г. работ (падрыхтоўка глебы, пасеў, догляд, уборка, малацьба і г. д.). Брыгада, выконваючы ўсе працэсы работ на замаваным за ёю вучастку вясе поўную адказнасьць за выкананьне заданьня па выхаду прадукцыі.

За перавыкананьне заданьня па выхаду прадукцыі звыш устаноўленага плянам брыгада атрымлівае: за кожны цэнт. зернавых 3-4 працадня, за кожны цэнт. валакна 7-10 працадзён, за кожную тону бульбы 7-10 працадзён, за кожны цэнт. гародніны 3-5 працадзён.

Пры недаатрыманьні прадукцыі, згодна вытворчага заданьня, робіцца зьніжэньне працадзён у такіх-жа разьмерах за кожную вызначаную вышэй адзінку.

3. Абавязаць партыйныя і калгасныя органы правесьці арганізацыю брыгад па вытворчым прынцыпе да 1-га красавіка.

Пры фармаваньні брыгад выходзіць з неабходнасьці лепшага падбору людзей для работы па асноўных вядучых галінах гаспадаркі ў адпаведнасьці са спэцыялізацыяй, адначасова недапускаючы непатрэбнай аддалёнасьці, па месцы жыцьця ўдзельнікаў аднэй і той-жа брыгады.

4. У мэтах ліквідацыі абязьлічкі ў карыстаньні с. г. машынамі, мэханізацыяй і жывой цягавай сілай не пазьней 1 красавіка замацаваць за кожнай брыгадай с. г. інвэнтар, машыны, трактары за трактарыстамі, с. г. машыны і інвэнтар унутры брыгады за калгасьнікамі. Калгасьнікі, за якімі замацаваны інвэнтар, с. г. машыны і збруя, павінны вазіраць за захаваньнем, своячасовасьцю і добрай якасьцю рамонту замацаваных за імі машын, інвэнтару і збруі і несьці за іх матар'яльную адказнасьць.

Дробны бягучы рамонт ляжыць на абавязку таго калгасьніка, за якім замацаваны інвэнтар, машыны і збруя.

Для ліквідацыі абязьлічкі ў карыстаньні коньмі, замацаваць коней за брыгадамі, а ўнутры брыгады—за калгасьнікамі, падагнаць збрую і ўстанавіць так; парадак, пры якім да кожнага каня павінна быць прымацавана збруя, і, як правіла, на ім можа працаваць адзін калгасьнік. За стан конскай цягавай сілы адказваюць калгасьнікі, да якіх прымацаваны коні і канюхі, якія даглядаюць за коньмі.

За беражныя адносіны да замацаваных да калгасьнікаў коней, за падтрыманьне добрай упітанасьці, калгасьнікам устанаўляецца прэмія ад 10 да 20 проц. працадзён, выпрацаваных калгасьнікам. За дрэнныя адносіны да коней, дрэнную упітанасьць робіцца зьніжэньне працадзён у разьмеры ад 10 да 30 проц. працадзён, выпрацаваных калгасьнікам.

За падзёж коней ад нядобраякаснага догляду на віне калгасьніка, які прапаваў на гэтым кані, калгасьнік аплачвае калгасу кошт паўшага каня.

5. Эфэктыўнасьць калектыўнай гаспадаркі залежыць у значнай ступені ад таго, наколькі пасьпяхова праходзяць работы ў такія напружаныя пэрыяды с. г. работы, як пасеў, уборка, апарос і г. д. Лічыць неабходным прадугледзіць такі парадак налічэньня працадзён за выкананьне і перавыкананьне норм выпрацоўкі, каб удзел у калгасным вытворчасьці ў напружаныя пэрыяды с. г. работ даваў права на атрыманьне большай часткі ўраджаю і даходаў, чым работа ў той час, калі калгасу менш патрэбна працоўных затрат. Для гэтай мэты ўвесьці ў сыстэму налічэньне павялічанай колькасьці працадзён за работу ў часе пасеву, уборкі, апаросу і інш. напружаных пэрыядаў работ, утвараючы адначасова сідкі пры разьмеркаваньні ўраджаю і даходаў за нявыхад на работу ў напружаны пэрыяд.

Пры арганізацыі брыгад і разьмеркаваньні рабочай сілы па брыгадах з усёй сур'ёзнасьцю ўлічыць неабходнасьць поўнага скарыстаньня жаночай рабочай сілы і падлеткаў, узьнімаючы кваліфікацыю іх і даручаючы такую работу, на якой яны могуць забясьпечыць найбольшую эфэктыўнасьць працы. ЦК асабліва ўказвае на неабходнасьць навучаньня жаночай працаваць на складаных с. г. машынах.

6. Надаючы вялізарную ролю брыгадзіру ў арганізацыі калектыўнай вытворчасьці, пры арганізацыі брыгад безадкладна прызначыць брыгадзіраў з ліку лепшых перадавых калгасьнікаў. Склад брыгадзіраў павінен быць, бязумоўна, пастаянным, што дасьць магчымасьць хутчэй узьнімаць кваліфікацыю іх і ператвараць у сапраўдных арганізатараў калектыўнай вытворчасьці. Увесьці ў сыстэму ўжо распаўсюджаную практыку ацэнкі работ брыгадзіраў у залежнасьці ад выробаткі ўсёй брыгады.

Апэрацыйнае кіраўніцтва брыгадай ажыцьцяўляецца непасрэдна брыгадзірам. Брыгадзір асабіста нясе адказнасьць за ўсю работу брыгады. У сваю чаргу брыгадзір патрабуе асабістай адказнасьці за даручаную работу ад кожнага калгасьніка. У сваёй рабоце брыгадзір абапіраецца на брыгадныя вытворчыя нарады, якія павінны рэгулярна праводзіцца для абгаварэньня пытаньняў па больш хуткім і добраякасным выкананьні заданьня.

Абавязаць РК КП(б)Б і фракцыі калгасаюзаў забясьпечыць дасканалы вучот брыгадзіраў і сыстэматычнае правядзеньне работы па ўзьняцьці іх кваліфікацыі, шляхам правядзеньня інструкцыйных спэцыялізаваных нарад (нарады брыгадзіраў па тэхнічных культурах, жывёлагадоўлі, зярнёвых культурах і г. д.), а таксама шляхам правядзеньня курсаў, снабжэньня с. г. спэцыяльнай літаратурай, арганізуючы завочнае навучаньне і г. д.

7. Адказнасьць за арганізацыю своячасовага і правільнага вучоту працы ў брыгадзе ўскладаецца на брыгадзіра. У буйных брыгадах у дапамогу брыгадзіру вылучаецца спэцыяльны вучотчык. Забясьпечваючы своячасовы і правільны вучот працы ў працаднёх, выключна выходзячы з колькасьці і якасьці выкананай кожным калгасьнікам працы, неабходна адначасова весьці рашучую барацьбу з разбазарваньнем працадзён і з маючымі месца скажэньнямі, якія выражаюцца ў замене працадня, як расцэнкі выконваемай адзінкі работы, рабочым днём, г. зн. часам, праведзеным на рабоце, бяз вучоту колькасьці і якасьці працы.

Пры ажыцьцяўленьні зьдзельшчыны ў калгасах ЦК абавязвае калгасныя органы і партыйныя арганізацыі кіравацца наступным указаньнем ЦК УсеКП(б) «ажыцьцяўленьне на справе рашэньняў VI зьезду саветаў аб укараненьні зьдзельшчыны, палепшаньні вучоту і ацэнцы працы кожнага калгасьніка ў працаднёх, у залежнасьці ад колькасьці і якасьці вытвараных ім работы, працягвае заставацца важнейшай задачай. У той-жа час ЦК пераслядае ад празьмернага ўскладненьня формы зьдзельшчыны, увядзеньня прагрэсыўнай зьдзельшчыны, увядзеньня індывідуальных форм зьдзельшчыны там, дзе гэта ня выклікаецца ўмовамі вытворчасьці (напрыклад, на пахаці, малацьбе), супроць спробаў перавесьці аплату працы калгасьнікаў на грашовую зарплату, супроць падмены работы праўленьня калгасу голым адміністраваньнем з боку партыйных і савецкіх арганізацый, супроць перавышэньня прынятых у статуце с. г. арцеляй разьмераў адлічэньняў у розныя фонды».

8. Абавязаць Трактарацэнтр і дырэктароў МТС забясьпечыць сваю работу па арганізацыі працы так, каб калгасы МТС у сапраўднасьці зьяўляліся прыкладнымі ў арганізацыі працы, падвышэньні прадукцыйнасьці працы, забясьпечыўшы максымальнае скарыстаньне рабочай сілы, машын і трактараў, ліквідаваўшы поўнасьцю абязьлічку ў рабоце на машынах.

Для ўпарадкаваньня разьліку з трактарыстамі, якія працуюць у тых калгасах, дзе яны не зьяўляюцца членамі калгасу, арганізаваць разьлікі за іх работу праз МТС. Калгасцэнтру і Трактарацэнтру даць указаньні аб парадку ацэнкі работы трактарыстаў, выходзячы з таго, каб пры ацэнцы працы абавязкова ўлічваўся ня толькі колькасны аб'ём выкананай работы, але і якасныя паказьнікі (якасьць успашкі, сяўбы, уборкі і г. д.).

Надаючы вялізарную ролю і адказнасьць машынатрактарных станцый ва ўсёй рабоце па арганізацыйна гаспадарчым умацаваньні калгасаў, стварэньня калгаснага актыву і падвышэньня ўраджайнасьці. ЦК абавязвае партыйныя арганізацыі на справе ўзмаціць штодзённую дапамогу машына-трактарным станцыям, палепшыць кіраўніцтва ўсёй гаспадарчай работай іх і забясьпечыць лепшы падбор кадраў.

9. ЦК указвае партыйным арганізацыям на вялізарнейшую ролю калгаснага актыву. Стварэньне калгаснага актыву, шляхам выяўленьня з ліку ўдарнікаў-удзельнікаў сацпаборніцтва, брыгадзіраў і г. д. і выхаваньня яго, зьяўляецца важнейшай палітычнай задачай партыйных арганізацый. Толькі, апіраючыся на калгасны актыў, найбольш пасьпяхова будуць вырашаны задачы барацьбы за ўраджай, за выкананьне пляну загатовак, за разьвіцьцё жывёлагадоўлі, сапыялістычнае перавыхаваньне калгасных мас і г. д.

10. Абавязаць Калгасцэнтр і НКЗ на працягу 5-ці дзён распрацаваць канкрэтныя ўказаньні калгасам і калгасам на аснове гэтае пастановы і разам з Дзяржвыдавецтвам не пазьней 20 сакавіка выдаць ня менш 5 папулярных брашур па асноўных пытаньнях арганізацыі працы ў калгасах.

Калгасцэнтру і НКЗ пры распрацоўцы канкрэтных указаньняў раёнам улічыць асаблівасьць хутарскіх раёнаў. Адначасова ЦК папярэджвае партыйныя арганізацыі хутарскіх раёнаў, што асаблівасьці гэтых раёнаў могуць перашкаджаць арганізацыі брыгад па вытворч

Пастанова № 648

АБ'ЯДНАНАГА ПАСЕДЖАНЬНЯ ПРЭЗЫДЫУМУ ЦКК І КАЛЕГІІ НК РСІ БССР АБ СТАНОВІШЧЫ ВЕДАМ СЬЦЬВЕННАЙ РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫІ Ў САВЕЦКІМ АПАРАЦЕ І МЕРАХ ДА ЯЕ ЎЗМАЦНЕНЬНЯ.

На падставе матар'ялаў праверкі канстатаваць, што, адсутнасць сістэматычнай рацыяналізатарскай работы ў большасці савецкіх установ сведчыць аб тым, што рацыяналізацыя свайго апарату яшчэ не зрабілася абавязковай і сталай функцыяй кожнай установы (XVII партканферэнцыя).

Асноўнымі недахопамі ў гэтай рабоце зьяўляюцца наступныя:

а) з боку кіраўнікоў установ і грамадзкіх арганізацый (парт'ячэек, мясцкомаў, камсамолу) не вялізнацца належная увага разгортванню і ўзмацненьню рацыяналізатарскай работы;

б) у рэдкае установ (ВСНГ, НКСнаб, НКФін, Дзяржбанк, Менгарсавет і інш.) не ўкамплектаваны штатныя пасады рацыяналізатараў;

в) няма ўліку паступаючых рацыяналізатарскіх прапаноў, іх рэалізацыі і эфэктыўнасьці праведзеных рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў;

г) у большасьці ўстаноў практычная работа рацыяналізатараў і вытворчых сэкцыяў мясцкомаў прупусцца, галоўным чынам, на пытаньнях вузкай і дробнай канцэлярыцкіны;

д) рабочыя шэфствуючых прадпрыемстваў, за выключэньнем нямногіх установаў (НКЮ, НКФ)—зусім ня ўцягваюцца ні ў праверку выкананьня дырэктываў па рацыяналізацыі, ні ў практычную рацыяналізатарскую работу;

е) зусім слабое кіраўніцтва з боку цэнтральных установаў і наркоматаў рацыяналізатарскай работай на сваёй пэрыферыі (НКЮ, НКЗ, ВСНГ, Дзяржбанк і інш.).

Кіраўнікі і грамадзкія арганізацыі раду ўстаноў да гэтага часу не зразумелі, што:

«станкі-пагардлівым адносінам да работы па палепшаньні апарату кіраўніцтва і пробка-бюрократыяй недацэнцы адносна роли дзяржапарату» (Молатаў), як сапраўднаму праўленьню працаю апаратуцаму на практыцы,—павінен быць пакладзены канец.

На падставе адзначанага, прэзыдыум ЦКК КП(б)Б і калегія НК РСІ БССР пастанаўляюць:

І. Абавязаць кіраўнікоў усіх устаноў:

а) забясьпечыць шырокае разгортваньне рацыяналізатарскай работы, як у цэнтральным апараце, так і па ўсёй сеткі сваіх мясцовых органаў, увязваючы гэтую работу ўнутры ведамстваў у вядомым плане кіруючай ведамсьцьвенай установы (Наркамзем, Наркамзем і г. д.). Пляны рацыяналізатарскіх работ установ на 1932 г. у месячны тэрмін скласьці і ўзгадніць з органам РСІ;

б) У месячны тэрмін укамплектаваць штатныя пасады рацыяналізатараў кіраўніцтва, вылучаючы на гэтую работу найбольш здольных работнікаў з лепшых актывістаў. Ва ўстановах, ня маючых штатных пасад рацыяналізатараў—работу па рацыяналізацыі ўскласьці на аднаго з супрацоўнікаў па сумяшчэньні.

2. Асноўная ўвага рацыяналізатарскай работы па ўстановах павінна быць эрупавана на асноўных пытаньнях перабудовы, спрашчэньні і палепшэньні работы савецкага апарату, і ў першую чаргу на:

а) палепшаньні функцый і структуры апарату, размежаваньні функцый паміж часткамі апарату, ліквідацыі абязьлічкі і ўстанаўленьні правоў і абавязкаў кожнага работніка ў апараце з тым, каб «адказнасьць усіх супрацоўнікаў была зноў дакладна і індывідуальна ўстаноўлена» (Ленін);

б) распрацоўцы канкрэтных мерапрыемстваў па ўмацненьні працоўных мас у работу апарату і кантролі над яго дзейнасьцю; вылучэньні і перадачы функцый, падлягаючых выкананьню рабочымі, на аснове сац-намесьніцтва, мэтадах і формах работы сац. на месьцінках;

в) сістэме і мэтадах кіраўніцтва вышэйстаячымі органамі, сувязі з імі;

г) распрацоўцы і ўкараненьні заахвочваючай сыстэмы аплаты працы, на вытвараньні гаспадарчага разьліку, на выкарыстаньні такіх форм і мэтадаў работы апарату, якія максымальным чынам садзейнічалі б разгортваньню сацспаборніцтва і ўдарніцтва;

д) пастаноўцы ў апараце кантролю за выкананьнем у кіраўніку прыцягненьня да яго шырокіх мас працоўных і грамадзкасьці самой установы, арганізацыі выкананьня і праверкі выкананьня па сутнасьці;

е) распрацоўцы мэтадаў і форм складаньня пляноў і арганізацыі сыстэмы плянаваньня з тым, каб работа па складаньні пляноў была даступна, арэзумела шырокім масам працоўных і каб яны мелі магчымасьць удзельнічаць у складаньні пляноў;

ж) «прыстасаваньні дзяржапарату да найлепшага абслугоўваньня мас» (XV зьезд УсесКП(б).

в) распрацоўцы мерапрыемстваў па рашучым скарачэньні заседжаньняў і па барацьбе з «заседательской оспей» (непатрэбныя нарады, камісіі і інш.).

3. Канцэнтруючы сваю ўвагу на асноўных моментах рацыяналізатарскай работы, рацыяналізатар і грамадзкасьць установ ставіны таксама займацца палепшаньнем тэхнікі работы з тым, каб рацыяналізацыя яе ляжала на непасрэдных тэхнічных выканаўцах і праводзілася імі ў абавязковым парадку па заданьнях рацыяналізатарскага плану і пры кансультацыі з боку рацыяналізатара.

4. Абавязаць кіраўнікоў усіх устаноў:

а) арганізаваць пастаянны ўлік рацыяналізатарскіх прапаноў, кантроль аз іх жыцьцяўленьнем і ўлік эфэктыўнасьці (у рублёх) праведзеных рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў;

б) зьясьніць у кантарыцах выдаткі на затраты па рацыяналізацыі апарату, на стварэньне прэміяльнага фонду і падрыхтоўку рацыяналізатарскіх кадраў;

в) аб выніках рацыяналізатарскай работы, ажыцьцяўленьні рацыяналізатарскіх прапаноў і г. д. ня менш 2-х разоў у год рабіць справаздачу як на сходах рабочых шэфствуючага прадпрыемства, так і на сходах служачых установы.

5. У мэтах укараненьня лепшага вопыту ў работу па сыстэме ведамстваў, лічыць неабходным, непасрэдна сламі ведамстваў пачаць арганізацыю ўзорнага апарату, для чаго прапанаваць Дзяржбанку, Белкаапсаюзу, ВСНГ, Наркамснабу—на лініі сваёй сеткі ў адзэй з установаў (Аддзяленьне банку, ЦРК і г. д.)—правесьці вопыт пастаноўкі арганізацыі ўзорнага апарату.

Вынікі пастаноўкі праз 6 месяцаў заслухаць на калегіі НК РСІ.

6. У мэтах увязкі работы рацыяналізатараў і накіраваньня сыстэматычнага абмену вопытам у галіне рацыяналізацыі ўстаноў, блізкіх паміж сабой па сутнасьці работ,—абавязаць ВСНГ, Наркамснаб, НКФ, НКЗ і Белкаапсаюз арганізаваць пры рэспубліканскіх цэнтрах (пры ВСНГ—для аб'яднаньняў, пры Наркамснабе—пачынаючы загатоўчых установ, пры Наркамфіне—фінорганаў і банкаў, пры Наркамземе—земорганаў і сельскагаспаарганаў, пры Белкаапсаюзе—для абнальнуў і ЦРК)—куставыя аб'яднаньні рацыяналізатараў.

Групе савецкага апарату даць пераказаны аб парадку арганізацыі аб'яднаньняў.

7. У мэтах сыстэматычнага абмену вопытам па рацыяналізацыі кіраўніцтва абавязаць гарадзкія і раённыя КК-РСІ пэрыядычна скліканьні нарады работнікаў па рацыяналізацыі, працуючых у гарадзкіх і раённых установах.

8. Абавязаць кіраўнікоў устаноў на працягу дэкады прыняць меры да выкананьня данай пастановы, шляхам канкрэтнага разьмеркаваньня паміж пэўнымі работнікамі пасобных пунктаў, з указаньнем што, каму і ў які тэрмін зрабіць.

9. Абавязаць парт'ячэйкі савецкіх устаноў узмацніць работу ў кірунку рацыяналізацыі і спрашчэньня апарату, абгаварваючы на нічэйцы становішча рацыяналізатарскай работы ў апараце, найбольш буйныя рацыяналізатарскія праекты, вынікі праведзеных рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў і г. д.

10. Прасіць ЦСПСБ зьвярнуць увагу на слабую работу назавых прафарганізацый па мабілізацыі грамадзкай думкі на разгортваньне і ўзмацненьне ведамсьцьвенай рацыяналізацыі і на слабую работу самых прафорганаў у справе спрашчэньня і палепшаньня работы савецкага апарату.

11. У мэтах падышэньня тэарэтычнага ўзроўню рацыяналізатараў, працуючых за ўстановах, абавязаць інстытут савецкага будаўніцтва і права распрацаваць пытаньне і арганізаваць пры інстытуце вечэрнія рацыяналізатарскія курсы. Фінансаваньне курсаў ускласьці на установы, якія камандзіруюць работнікаў для перападрыхтоўкі.

12. Прыняць да ведама, што кіраўнікі навучальных установ, пераліченых у дадаваемым пры гэтым сьпісе,—абавязаліся ў мэтах укараненьня рацыяналізатарскіх ведаў сярод падрыхтоўваемых работнікаў савецкага апарату,—прадугледжваць у праграмах і забясьпечваць выкананьне дысцыпліны па рацыяналізацыі ў падпарадкаваных ім навучальных установах.

Мэтадалёгічнае і мэтадычнае кіраўніцтва выкананьнем дысцыпліны па рацыяналізацыі справы кіраваньня, увязку навучальнай работы і падбор навуковых работнікаў—ускладаецца на катэдру рацыяналізацыі Інстытуту савецкага будаўніцтва і права пры прэзыдыуме ЦВК БССР.

13. Групе савецкага апарату разам з Інстытутам асыпірантуры БАН прапрацаваць пытаньне аб падрыхтоўцы пры інстытуце назуковых кадраў па выкладаньні рацыяналізацыі кіраваньня ў вышэйшых і сярэдніх навучальных установах.

14. Гэтую пастанову апублікаваць у друку.

15. Тав. Няфодаву да 1-II—32 г. дабіцца ад устаноў канкрэтнай рэалізацыі данай пастановы згодна п. 8.

Старшыня ЦКК КП(б)Б і Нарком РСІ БССР **КАЛНІН.**

Дадатак да пастановы аб'яднанага паседжаньня прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б і калегіі НК РСІ БССР.

СЬПІС

вышэйшых і сярэдніх навучальных установ, кіраўніцтва якіх абавязваюцца прадугледжваць у праграмах і забясьпечыць выкладаньне дысцыпліны па рацыяналізацыі кіраўніцтва.

1. Камуністычны унівэрсытэт (Савецкае аддзяленьне).
2. Інстытут савецкага будаўніцтва.
3. Плянава-эканамічны інстытут.
4. Плянава-статыстычны тэхнікум.
5. Фінансава-эканамічны інстытут.
6. Вышэйшыя фінансава-эканамічныя 2-х гадовыя курсы.
7. Фінансава-эканамічны тэхнікум.
8. Беларускі інстытут спажывецкай кааперацыі.

За парушэньне савецкай палітыкі цэн—да адказнасьці

Пастанова Дзяржаўнай Інспэкцыі цэн пры НК РСІ БССР 17 лютага 1932 г.

Разглядзеўшы матар'ялы Віцебскай гар.КК РСІ аб няправільным устанаў леньні цэн на рыбу Віцебскім вучастакам Белрыбаксаюзу, што вызначылася.

а) У незаконным павышэньні цэн на рыбу на 20 проц., плюс 67 проц., што такія процанты павышэньня цэн на рыбу нікім не ўстаноўлены, чым і парушылі пастанову Камітэту Цэн пры СНА,

б) Што гэтае парушэньне аб павялічэньні цэн на 20 проц. было выклікана дзякуючы няправільнай дачы дырэктыў з боку старшыні праўленьня Белрыбаксаюзу т. Кушнеровым і галоўбухам т. Буракам.

в) Што віцебскі вучастак Белрыбаксаюзу прымяніў самавольнае падвышэньне цэн на 67 проц.

Выходзячы з вышэйуказанага Дзяржаўная Інспэкцыя Цэн пры НК РСІ пастанаўляе:

I.

Прапанаваць старшыні праўленьня Белрыбаксаюзу т. Кушнерову пад асабістую адказнасьць адмяніць няправільныя дырэктывы пасланыя сваім філіялам аб незаконным падвышэньні цэн не пазьней 18 лютага 1932 г.

II.

За парушэньне пастановы Камітэту Цэн пры СНА—старшыні праўленьня Белрыбаксаюзу т. Кушнерову вынесьці вымову, галоўбуха т. Бурака аштрафаваць на 50 руб.

Кіраўніку віцебскага вучастку Белрыбаксаюзу т. Дубаўцу вынесьці вымову і папярэдзіць, што ў выпадку паўтарэньня парушэньня савецкай палітыкі цэн, ён будзе прыцягнуты да крымінальнай адказнасьці.

Кіраўнік Дзяржаўнай Інспэкцыі Цэн пры НК РСІ БССР
Талачоў.

Гуканы кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“ Каса з 1 г. дня — **КЕНІГСМАРК**

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“ Каса ад 12 гадз. — **Бяспрытульны спартсмэн**

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ“ — **Злачынства і пакараньне**

Рэдакцыі газэт „Савецкая Беларусь“ і „Калгасьнік Беларусі“,

разам з Цэнтральным штабам па ўзмацненьні зьнатовак скарыраўны пры Беларускай Канторы „Саюзскур“

склікаюць на 25 лютага г. г. а 6 гадзіне ўвечары нараду

з наступнай абвесткай дню:

Аб становішчы забясьпечаньня прамысловасьці скурсыравінай і далейшыя задачы.

На нараду павінны зьявіцца прадстаўнікі ЦП саюзу скурнікаў, заводу „Бальшавік“, Менскай абутковай ф-кі, Белкаапсаюзу, Белскурабяднаньня, НКСнабу, Калгасцэнтру, Белжывсаюзу, Сьвінаводу

Запрашаюцца прадстаўнікі газэт: „Зьвязда“, „Рабочай“, „Акцябр“, „Чырвоная Змена“ і „Орка“.

Нарада адбудзецца ў памяшканьні рэдакцыі газэты „Савецкая Беларусь“, (Плошча Волі, 17)

ДА ВЕДАМА ўсіх ФЗМК і лесрабачкомаў саюзу Лесдрэўрабочых

Усебеларуская канфэрэнцыя прафсаюзу Лесдрэўрабочых

СКЛІКАЕЦЦА 3-га сакавіка ў г. ВІЦЕБСКУ

Дэлегаты будуць разьмешчаны ў Доме сплаўшчыкаў (Набережная вул., канфэрэнцыя будзе праходзіць у клюбе Дрэваапрацоўнікаў.

Прэзыдыум БРК саюзу Лесдрэўрабочых

БЯРЭЗІНСКІ РАЙСПАЖЫУСАЮЗ

паведамляе ўсе зацікаўленыя ўстановы і асобы якія мелі прэтэнзіі да былога Бярэзінскага Райспажыўтаварыства ў 1931 годзе

пав'нны прад'явіць свае прэтэнзіі ў двухтыднёвы тэрмін

— з дня апублікаваньня.

Пасьля гэтага ніякія прэтэнзіі прымацца ня будуць

Бярэзінскі Райспажыўсаюз

Транспарту патрэбен здаровы вагон

Не фіксаваць дэфэкты,

А папраўляць і папярэджваць іх

Магілёўскі абменны пункт, замест сапраўднага аздараўленьня вагонаў, толькі фіксуе дэфэкты. Партарганізацыя вузла не забясьпечыла яго добрым кіраўніцтвам. Пункт ня мае неабходных матар'ялаў, інструманту і кваліфікаваных работнікаў. Мабілізаваць сілы для таго, каб рашуча падцягнуць абменную работу!

АБМЕН-ГЭТА РАМОНТ

У мэтах аздараўленьня вагоннага парку, некалькі месяцаў назад паміж чыгункамі і вузламі арганізаваны абменныя пункты. Арганізацыя гэтых пунктаў павінна была рашучым чынам дапамагчы аздараўленьню вагоннай гаспадаркі, рэзка зьнізіць процант хворых вагонаў, якія ходзяць па шляхох.

Аднак, ці ўсюды дасягнута патрэбнае? Ці ўсюды абменныя пункты зьяўляюцца ня толькі кантралёрамі якасьці вагонаў, а і папраўшчыкамі дэфэктаў, заўважаных у іх. Факты, якія прыводзяцца ў матар'яле аб Магілёўскім абменным пункце, сьведчаць аб тым, што ня ўсюды справа абстаіць добра. Замест сапраўднага аздараўленьня вагонаў, замест папраўленьня дэфэктаў, з якімі вагоны ідуць ад Заходніх і ад МББ, Магілёўскі пункт займаецца фіксацыяй папраўак і спагнаньнем штрафаў.

Трэба прызнаць і тое, што абменныя пункты (ня толькі Магілёўскі, а і іншыя) яшчэ і да гэтага часу не забясьпечаны добрым складам кваліфікаваных працаўнікоў, поўнасьцю не забясьпечаны патрэбнымі матар'яламі, інструманам і запаснымі часткамі. Аднак гэта ні ў якой ступені ня здымае адказнасьці з абменных пунктаў за зьнішчэньне дэфэктаў. І гэтая адказнасьць узмацняецца тымі больш, што мноцца выпадкі, калі ўсе наяўныя магчымасьці не скарыстоўваюцца, калі за работу ніхто не нясе адказнасьці.

Аб тым, што на работу абменных пунктаў з боку арганізацый на чыгунках ня зьвернута належная ўвага сьведчыць ня мала фактаў. Наяўнасьць абязьлічкі ў рамонце, ураўнілаўцы—у запраўцы, выпадкі недабраякаснага рамонту—вось факты.

Яшчэ даўней мы ўзьнімалі пытаньне аб работе Віцебскага і Жлобінскага рамонтных пунктаў, якія дрэнна якасьцю свайго рамонту перашкаджаюць работе Магілёўскага абменнага пункту. Гэта сьведчыць аб тым, што партарганізацыі Віцебскага і Жлобінскага чыгуначных вузлоў не аддалі належнай увагі рамонту вагонаў.

А гэта ўсё з асаблівай вострасьцю высоўвае перад партыйнымі, прафсаюзнымі арганізацыямі і гас падарнікамі пытаньне ўсямернага наладжваньня работы абменных пунктаў. Бальшавіцкая адказнасьць за работу абменных пунктаў — зарука таго, што работа будзе наладжана. Ад рамонтных пунктаў трэба патрабаваць высокаякаснага і ўдарнага рамонту. Высокаякасны і ўдарны рамонт павінны даваць і абменныя пункты. Абмен вагонаў—гэта рамонт вагонаў, гэта адхіленьне і папярэджаньне ўсіх магчымых дэфэктаў.

Дэфэкты папраўляліся... сьнегам

(Ад нашага карэсп.)

Некалькі месяцаў існуе абменны пункт у Магілеве. Пункт уключыўся ва ўсесаюзны конкурс абменных, але гэты абавязак не зрабіў належнага ўплыву на яго работу, масы не мабілізаваны на баявы ўдзел у конкурсе, на заваяваньне лепшага месца шляхам ударнай работы. Пра становішча на пункце могуць гаварыць шматлікія факты.

ФІКСАЦЫЯ ЗАМЕСТ РАМОНТУ.

Так, тэндэнцыя пратакольных налічэньняў па дэфэктах вагонаў, што праходзяць абменны пункт; налічэньняў, якія даходзяць проста да астранамічнай вялічыні—яшчэ ня зжыты. Грашовымі штрафамі, фіксацыяй дэфэктаў—замест ліквідацыі іх—скажаецца сама ідэя абмену. За студзень з МББ налічана 518.102 руб. 60 кап. штрафу, з Заходніх — 478.422 руб. 10 кап. Работнікі Заходняй схільны нават ганарыцца, што яны «зарабілі» такім чынам 39.680 руб. 50 кап.

Кошт аднаго вагону (па пратаколе), які ідзе а МББ, складае 41 руб. 73 кап., а вагону з Заходніх—37 руб. 73 кап. На такую суму, значыць, вагон мае дэфэктаў. А што робіцца для выяўленьня дэфэктаў, для іх папраўкі? Вось красамоўныя лічбы: Заходняя выдаткавала на рамонт вагону ў першай дэкадзе студзеня 1 руб. 22 кап., у другой—1 руб. 30 кап., у трэцяй—1 р. 70 кап. Толькі ўсяго. Вагоны фактычна ідуць з чыгункі на чыгунку хворымі.

Есьць факты, калі дэфэкты на рэсорах не папраўляліся, а... замазваліся сьнегам. Адзін сьлёсар дадумаўся нават да такой штукі: ідучы са стрыжнёвай гайкай, ставіў яе там дзе трэба, потым здымаў і ставіў на наступны вагон. Так, праз увесь час прыёму цягніка. А ў канцы прыёму панёс гайку з сабой, каб і другі раз «аздараўляць» ёй вагоны.

Адчэпкі па дэфэктах тэхнічнага параду растуць. З боку Заходніх за першую дэкаду студзеня адчэплена 11 вагонаў, за другую—27, за трэцюю—28. З боку МББ—за першую дэкаду—11, другую—20, трэцюю—23. З Заходніх вагоны ідуць з вострым грэбнем, паламанымі буферными брусамі і падлогамі, паслабленымі бандажамі; з МББ—паслабленыя бандажы, гарэньне букс.

Злачынным нядбайствам можна тлумачыць тое, што з боку МББ за студзень давялося адчапіць 26 замежных вагонаў з пратэрмінаваным агляданам, за прастой якіх плоціцца валюта.

РАМОНТНЫЯ ПУНКТЫ ДРЭННА РАМАНТУЮЦЬ

Магілёўскі абменны пункт з самага пачатку работы быў з'вязаны з рамонтнымі пунктамі ў Жлобіне і Віцебску. Рамонтныя работы ў гэтых пунктах не наладжаны, што таксама тармозіць работу абменнага.

Пра забясьпечэньне абменнага пункту інструментам і матар'ялам ніхто як след не клапоціцца. Работнікі МББ нават ня маюць шаблёнаў для вымяраньня бандажоў. З Заходнімі здараюцца і такія «фокусы»: паслаў вагон нясправўных рэсор на Калускі завод для рамонту, праз месяц прыйшлі рэсоры, аказалася, што вагон той самы і рэсоры ў ім тыя-ж самыя, нясправныя. Ворз'аўскія галавацяпы месяц пратрымалі вагон і вярнулі яго назад. З Гомелю пункт перадавалі высылкай 200 буферных стаканаў, якія аказаліся неапрацаванымі, у іх нават ня лезьлі пружыны.

Ня лепш і з камэрцыйным бракам. Віцебск і Жлобін і тут засталіся на вышыні сваіх «тэмпаў» і «якасьці». Ад нойчы за палову дня з боку Жлобіна адчэплена 5 вагонаў бяз штыра, адзін—з гранёным балтом, два—бяз дзьвер, ных закладак, адна пляцформа з няправільнай увязкай. З боку МББ за гэты-ж час давялося адчапіць 10 бруд ных вагонаў, адзін—з паламанай лабавой сьценкай, адну пляцформу без сярэдняй увязкі грузу. Ня зжыты засылкі на абмен вагонаў без дакумэнтаў і дакумэнтаў без вагонаў. З 13 па 23 студзеня з боку МББ было 9 такіх выпадкаў, а з 1 па 24 студзеня з боку Заходніх—34 выпадкі.

Надзвычай дрэнна працуе станцыя Магілёў. Вагоны з адхіленым камэрцыйным бракам блытаюцца па станцыі па 8 дзён. Станцыя лічыць, што за іх лёсам будзе сачыць перадача, а тая пакладаецца на станцыю.

Абязьлічка павялічвае прастой. Станцыя зрывае рамонт тэхнічнага параду. За студзень 37 вагонаў, замест рамонтных майстэрняў, хворымі пашлі ў цягніку. Адрамантаваныя-ж вагоны станцыя не забірае па 2-3 дні. Есьць выпадкі, калі станцыя не прад'яўляла на агляд цэлыя цягнікі і яны ішлі без перадачы, незаконна пераходзячы з чыгункі на чыгунку.

АБЯЗЬЛІЧАЛІ БАРАЦЬБУ З АБЯЗЬЛІЧКАЙ

Нават ліквідацыя вагоннай абязьлічкі Заходнімі і МББ фактычна абязьлічана. І ня дзіва: аддзелы цягі Віцебскага і Жлобінскага раёнаў нічога не зрабілі для наладжваньня работы па абмене, Памочнік начальніка аддзелу цягі Віцебскага раёну Крумін адзін раз ды і то выпадкова быў у Магілеве. Адзін раз трапіў у Магілёў работнікі вагоннай справы Заходніх чыгунак Красьнеўскі і Юркін. Вядома, пры такім «кіраўніцтве» справа будзе кульгаць.

Прафэсыянальная арганізацыя Магілёўскага вузла таксама перабудоўваецца марудна. Толькі ў апошнія дні цэхком вагоньнікаў разьбіты на дзьве адзінкі. Але работа гэтых адзінак яшчэ не разгорнута. Мясцком МББ да гэтага часу ня мае памяшканьня. Магілёўскі райком КП(б)Б ня кіруе ні яго работай, ні работай парт'ячэйкі МББ.

Парткалектыў вузла некалькі разоў займаўся пытаньнем работы абменнага пункту, выносіў рад канкрэтных пастаноў, але ня цікавіўся іх выкананьнем, кантролем над імі. Толькі ў апошні час згадалі пра гэты абавязак. Таксама толькі цяпер парт'ячэйка вагоньнікаў разьбіта на дзьве, каб палепшыць кіраўніцтва абменнай работай.

Ні партыйная, ні прафэсыянальная арганізацыя не завастрылі ўвагі на ўзятых абавязацельствах па ўсесаюзным конкурсе абменных. Мала зроблена для чоткай пастаноўкі работы па абмене. А вынікі гэтага сказваюцца ў фактах, пералічаных тут.

Партыйным, прафэсыянальным і гас падарчым арганізацыям Віцебскага і Жлобінскага чыгуначных раёнаў неабходна рашуча павярнуцца тварам да ліквідацыі вагоннай абязьлічкі. Фіксацыя дэфэктаў павінна быць неадклад на заменена сапраўднай работай па аздараўленьні вагонаў. Для работы трэба стварыць усе ўмовы, даць інструмант, матар'ял, вырашыць канчаткова пытаньне аб арганізацыі ў Магілёве буйнага рамонтнага пункту. Трэба падцягнуць работу станцыі. Разгорнуць сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва выжыць шкодную абязьлічку ў абменнай рабоце раз і назаўсёды.

Ташын.

Супроць буржуазнага скажэньня пытаньня барацьбы за тэхніку бясьпечнасьці

Прыток новых рабочых на нашы прадпрыемствы, неспаёмства гэтых рабочых, а часамі і няўменьне аўладаць станком высоўвае задачу ліквідацыі іх тэхнічнай неграмотнасьці ў першую чаргу. Такое мерапрыемства само на сабе выключае на прадпрыемствах рад нясчасных выпадкаў, якія выклікаюцца вельмі часта выключна тэхнічнай неграмотнасьцю. Задача асваеньня перадавой тэхнікі ва ўсю шырыню стаіць і перад старымі рабочымі. Зусім відавочна, што аўтаматызаваньня вытаходніцтва і рацыяналізацыі паменшаецца лік выпадкаў праўматызму.

Усё гэта ні ў якім разе не адмаўляе барацьбы за тэхніку бясьпечнасьці. Спэцыяльны тэхнічны нагляд, спэцыяльныя інстытуты па охове працы, цэлы рад заканадаўчых палажэньняў гаворыць аб тым, што арганізацыі тэхніці бясьпечнасьці на прадпрыемствах мы адкідаем выключную ўвагу.

Аб гэтым з усёй яскравасьцю гаворыць і пастанова СНК БССР ад 17 лютага 1932 г., якая з усёй катэгарычнасьцю падкрэсьлівае значэньне барацьбы за тэхніку бясьпечнасьці. Адной з рашаючых умоў узмацненьня тэхнічнай бясьпечнасьці павінна зьявіцца аўладаньне перадавой тэхнікай, разгортваньне вынаходніцтва і рацыяналізацыі.

Усякія іншыя ўстаноўкі па гэтым пытаньні зьяўляюцца не нашымі ўстаноўкамі, не ўстаноўкамі партыі, таму з усёй сілай мы павінны змагацца з пратаскаваньнем чужых нам установак па такім важнейшым пытаньні як тэхніка бясьпечнасьці.

У нашай газэце ад 23 лютага быў зьмешчаны артыкул Р. Капэльсона «Узьняць барацьбу за тэхніку бясьпекі». Гэты артыкул сваімі няправільнымі ўстаноўкамі скажае сэнс і няпрвільна арыентуе чытача па пытаньнях барацьбы за тэхніку бясьпечнасьці.

Дасталкова прывесьці некаторыя разважаньні аўтара, каб давесьці шкоднасьць артыкулу.

Па аўтару выходзіць, што клопаты аб тэхнічнай небясьпецы—справа выключна гаспадарнікаў. Аўтар у сваім артыкуле шпа аб рабочым як аб актыўным удзельніку сапраўдастычнага будаўніцтва, а як аб «рабочых руках», глядзіць на тэхніку бясьпечнасьці толькі як на сродак падняцьця працаздольнасьці гэтых «рабочых рук», ставіцца да рабочага, як гаспадарнік-гандляр. Артыкулы напісаны ў выразна-буржуазным духу і ні чога вугульнага ня мае з установкамі партыі па гэтым важнейшым пытаньні.

Аб тым, што аўтар падзяляе клясавага варожыя—буржуазныя ўстаноўкі аб тэхніцы бясьпечнасьці—паказваючага яскрава сьведчыць наступны абзац з яго артыкулу:

«Шмат разоў,—піша аўтар,—мы ня ведаем наколькі сур'ёзна наша страта, колькі тое, або іншае аграраньне нам каштуе; гэта ўжо апрача таго, што здароўе і жыцьцё рабочых пагоршылася».

Зусім відавочна, што аўтар артыкулу ўзводзіць паклёп на нашу партыю, на савецкую ўладу. Савецкая ўлада, адзіная ў сьвеце ўлада рабочых і сялян, прымае ўсе меры па зьвядзеньня та нуля сьмяшчасных выпадкаў». Савецкая ўлада арганізавала рад інстытутаў для распаўсюджэньня тэхніці бясьпечнасьці. Ва ўсёй нашай краіне, нашай улады ахова здароўя рабочых стаць у цэнтры ўвагі. Ніхто ў сьвеце, ні ў адной краіне не пастаўлена і ня можа быць пастаўлена так ахова здароўя рабочых, як у савецкай краіне.

Артыкул Капэльсона мае выразны сэнс буржуа-ліберала, яго ўстаноўкі зьяўляюцца няправільнымі, шкоднікамі. Капэльсон ніводным намёкам не гаворыць аб тым, што барацьба за тэхніку бясьпечнасьці—неадрыўная частка барацьбы за аўладаньне тэхнікай, барацьба за палепшаньне тэхнікі.

Адзначаючы няправільныя ўстаноўкі ў артыкуле Капэльсона, рэдакцыя прыхіляе сваю памылку, якая выявілася ў няўважлівых ліберальных адносінах да зьмяшчанага артыкулу.

Дырэктар студыі І. ПІГАРЦ

АПАВЯШЧЭНЬНІ

25 лютага а 7 гадз. веч. у Культпроп ЦК КП(б)Б пакой № 16 павінны прыйсьці наступныя таварышы: Галіна, Гурэвіч, Окур, Лур'е, Левін, Поташ, Радзецкі, Засьцянкер, Маргелёў, Эйнштэйн, Карнеенка, Вальфсон, Шапіра, Манаў, Валабрынскі, Чарнецкі, Булкевіч, Алтыш, Сьмірнова, Кравчук, Баран, Улазаў, Руды, Выдра, Орліс, Драгілёў, Скуман, Тартакоўская, Левін, Мазэль, Салей, Герман, Плостак, Чарнецк., Аляшкевіч, Кугельман, Кучынскі, Гайдук, Ільлюшын, Самахвалаў, Рагінская, Карабан, Бенсман, Майзэль, Айзенберг, Мельцер, Ганін, Бондар, Гершэльман, Ошараў, Аксельрод, Рохлін, Шчарбакоў, Лойка, Лібман, сакратары парт'ячэек: БДУ, Фінансавага Інстытута, ВПІ, Плянава-Эканамічнага Інстытуту, Саўбуду, Кааперацыйнага Інстытуту, Тарфянога і Хімічнага Інстытуту, Садова-гародняга Інстытуту, Будаўнічага, Аўта-Дарожнага і Энэргінстытуту, Мэдінстытуту і Мэдтэхнікуму, Пэдтэхнікумаў Беларускага, Яўрэйскага і Індустрыяльнага, Гідротэхнікуму, Архітэктурна-Будаўнічага тэхнікуму, Фінансава-эканамічнага тэхнікуму, Транспартна-дарожнага тэхнікуму, Музычнага—тэатральнага і Фізкультурнага тэхнікумаў.

Яўка памянёных таварышоў абавязкова.

Партканфэрэнцыя ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 28-II — 32 г. у Петрыкаве (РКК), а 10 гадзіне раніцы адбудзеньня паседжаньне выязной ПТ ЦКК па разглядзе партсправ наступных таварышоў:

1. Шэўка Сьпірыдон Мітраф. (Петрыкаў).
2. Шыраховіч Леў Ф. (Петрыкаў).
3. Лобая Александр Даніл. (Петрыкаў).
4. Башакава Лісавета Архіп. (Петрыкаў).
5. Равуцкі Ігнат Сьцяпан. (Петрыкаў).
6. Гомая Хаім (Петрыкаў).
7. Шыла Рыгор Фаміч (Петрыкаў).
8. Андрэйчыкава і Хількевіч (Петрыкаў).

Яўка пералічаных таварышоў абавязкова. Праезд за свой кошт.

Сакратар ПК ЦКК КП(б)Б Суханава.

Народны Камісарыят Земляробства БССР

5-га сакавіка г. г. у горадзе Менску

СКЛІКАЕ

БЕЛАРУСКІ РЭСПУБЛІКАНСКІ АГРАТЭХНІЧНЫ ЗЬЕЗД

З НАСТУПНАЙ АБВЕСТКАЙ ДНЮ:

1. Задачы сацрэканструкцыі сельскае гаспадаркі, аўладаньня агрозоатэхнікай, падвышэньня ўраджайнасьці і роля спэцыялістых (дакл. т. Рачыцкі).
2. Задачы арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і ўдзел спэцыялістых (дакл. т. Міцькоў).
3. Аб мэханізацыі і машынізацыі сельскай гаспадаркі, МТС, электрыфікацыя, апрацоўка (дакл. т. т. Каршакевіч, Захарэнка, інжынэр-мэханізатар і спэцыяліст па апрацоўцы валакністых культур).
4. Рэалізацыя пастаноў Партыі і Ўраду аб разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі і стварэньне кармавой базы (дакл. т. т. Масюкоў, Аўчыньнікаў і Бондар).

На зьезд запрашаюцца дэлегатамі ўсе райаграномы, старшыя аграномы райкалгассаюзаў, 40 чалавек старшых аграномаў МТС, 11 чалавек аграномаў станцый па барацьбе са шкоднікамі с.-г. расьлін, 15 зоатэхнікаў сьвінаводтрэстаў, 10 Малпраитрэсту, дырэктароў саўгасаў „Сьвінавод“—7 чалавек, Малпраитрэсту—7 чалавек, льносаўгасаў—2, 5 аграномаў Льноканапляводсаўгастрэсту, 5 аграномаў садова-гародніх саўгасаў, 6 вэтурачоў, 20 старшынь праўленьняў калгасаў больш буйных спэцыялізаваных, 20 загадчыкаў Райза больш буйных раёнаў, 20 старшынь райкалгассаюзаў, 18 прадстаўнікоў навукова-дасьледчых установаў, 20 лепшых ударнікаў, рабочых вынаходцаў саўгасаў, 10 ударнікаў МТС, 20 ударнікаў калгасаў, 5 загадчыкаў сьвінаводных таварных фэрм, 5 малочна-таварных фэрм і 25 чалавек брыгадзіраў калгасаў (па паляводству і жывёлагадоўлі).

Зьезд пачнецца 5 сакавіка г. г. а 6-й гадзіне ўвечары

Рэгістрацыя дэлегатаў, выдача мандатаў будзе вытварацца ў памяшк. Наркамзему, Савецкая, 71, ад 9 гадз. ран. 1-III г. г.

Старшыня аргкамісіі САКАЛОЎ

Сэкратар БАЙ

Беларуская Дзяржаўная Студыя Опэры і Балету

АБЯШЧАЕ ПРЫЁМ

на вакальнае і аркестровае аддзяленьні

Прыём заяў будзе ўтварацца з 25 лютага па